ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Літаратура і Мастацтва

Год выдання 34-ы
№ 56 (2005)
13 ЛІПЕНЯ 1965 г.
АЎТОРАК
Цана 4 кап.

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

МУЗЫЧНАЕ ЖЫЦЦЁ

Гомельскі суперфасфатны завод—пускавая новабудоўля. Ужо сёлета ўступіць у строй першая чарга прадпрыемства. Цяпер на прамысловай пляцоўцы вядзецца мантаж пячнога, прамыўнога і сушыльнаабсарбцыйнага аддзяленняў і многіх іншых аб'ектаў. Студэнты Гомельскага музычнага вучылішча—частыя госці на новабудоўлі. У абедзенны перапынак будаўнікі з задавальненнем слухаюць музыку ў іх выкананні.

Фота Ул. ЛУПЕЙКІ (БЕЛТА).

НОВЫЯ ТВОРЫ

Днямі адбылося пасяджэнне музычна-рэпертуарнай камісіі Міністэрства культуры БССР, на якой былі праслуханы новыя творы беларускіх кампазітараў. З буйных твораў набыты для выканання канцэрт для фартэпіяна з сімфанічным аркестрам у трох частках Г. Вагнера і канцэрт для фартэпіяна з сімфанічным аркестрам у трох частках для вучняў музычных школ П. Падкавырава.

Камісія набыла рад іншых твораў. Сярод іх — песня Э. Тырманд «Станем цясней за мір» на словы Е. Лось і камсамольская песня на словы М. Святлова, жартоўная песня Ю. Семянякі «Вяснушкі» на словы Ю. Благава, маналог для голасу з фартэпіяна С. Картэса «Пакланіся ім парыску» на словы Ю. Друнінай, саната для флейты і фартэпіяна Д. Смольскага і іншых кампазітараў.

НА КАШАРЫ

Кашара саўгаса «Судкова» Хойніцкага раёна размешчана на рэчцы Віць. Жыве і працуе там амаль сорак жывёлаводаў. Туды зрабіла свой чарговы выезд агітбрыгада Хойніцкага раённага Дома культуры. З радасцю сустрэлі даяркі і пастухі самадзейных артыстаў. Завязалася цікавая размова аб працы, адпачынку. Удзельнікі агітбрыгады правялі цікавыя гутаркі. В. Барсук расказаў аб падзеях у В'етнаме, а Г. Тышкевіч — аб жыццёвым і творчым шляху вялікага рускага кампазітара М. Глінкі. Вечарам у клубе кашары адбыўся канцэрт. Л. Іванюшка, С. Далянчук, Д. Аўтушкоў выканалі песні «Ласкавы вальс», «Званочак», «Дзе ж ты, чарнавокая» і іншыя. Спадабалася калгаснікам сцэнка з аперэты «Вяселле ў Малінаўцы» ў выкананні В. Барсука, Л. Жаўняк і А. Бондара.

У бліжэйшы час агітбрыгада наведае кашары калгасаў «Кастрычнік», імя Калініна і інш.

ГОСЦІ КАЛГАСНІКАЎ

Артысты Беларускага дзяржаўнага ордэна Леніна тэатра оперы і балета днямі пабывалі ў калгаснікаў сельскагаспадарчай арцелі «Новы быт» Мінскага раёна. Сёлета гэта іх пятая паездка ў вёску Дубецкая Слабада, дзе знаходзіцца цэнтральны клуб калгаса. Кіраўнікі арцелі расказалі гасцям аб росце грамадскай гаспадаркі. Затым артысты далі для калгаснікаў вялікі канцэрт.

Народная артыстка БССР С. Друкер, артысты Э. Шаўкавец, А. Калеснічэнка, В. Шляхавец праспявалі арыі з опер, рускія і беларускія народныя песні, творы савецкіх кампазітараў. Танцы з балетаў паказалі Г. Чарнаярава і С. Грахоўскі. З мастацкім чытаннем выступіла А. Каралёва. Кампазітар М. Наско пазнаёміў калгаснікаў са сваімі новымі творамі.

ПА ГАРАДАХ ПОЎДНЯ

Дагестан, Арменія, Грузія, Крым — такі маршрут гастрольнай паездкі Дзяржаўнага народнага аркестра БССР. Артысты нашай рэспублікі пазнаёмяць аматараў музыкі з сучаснымі, старадаўнімі і народнымі песнямі Беларусі. Першы канцэрт адбыўся днямі ў г. Махачкале.

У адказ на гастролі сімфанічнага аркестра Дзяржаўнай філармоніі на паўднёвым беразе Крыма, які выступае ў гарадах Беларусі, у паездку па Крыме рыхтуецца сімфанічны аркестр БССР. У гастролях прымуць таксама ўдзел артысты Н. Ткачэнка, І. Сарокін, Е. Эфрон. Праграма канцэрта складаецца з твораў рускіх, савецкіх і заходнееўрапейскіх кампазітараў.

У ГРАМЗАПІСУ

Мінскі Дом грампласцінак атрымаў вялікую партыю запісаў твораў замежных кампазітараў. Сярод іх—арабскае танга, танцы ў выкананні іспанскага танцавальнага аркестра, італьянскія лірычныя песні, а таксама англійская народная песня «Люблю», французская «Я чакаю», «Твая любоў» грачаская і многія іншыя. З ахвотай набываюць мінчане пласцінкі з песнямі, якія выконвае Раберціна Ларэці.

НА РУБЯЖАХ СЯМІГОДКІ

Расце і расце Гродзенскі азотнатукавы — гігант беларускай вялікай хіміі. Цяпер тут паспяхова манціруецца абсталяванне па вытворчасці аміяка і аміячнай салетры. Сярод перадавых мантажнікаў — Радзіслаў Шастак (злева) і Рамуальд Рэндаровіч.

Фота А. ПЕРАХОДА. (БЕЛТА).

ФОРУМ МІРУ

ТРЫ ДНІ назад сталіца Фінляндыі стала цэнтрам, да якога прыкавана ўвага народаў усёй зямлі. У дзелавой і ўрачыстай абстаноўцы тут, у Доме культуры, пачаў сваю работу буйнейшы міжнародны форум людзей добрай волі пяці кантынентаў — Сусветны кангрэс за мір, нацыянальную незалежнасць і раззбраенне. Дэлегаты і госці Сусветнага кангрэса прыбылі ў Хельсінкі з усіх куткоў зямнога шара. Іх паслалі сюды гераічны В'етнам і няскораная Ангола, бурны кантынент Лацінскай Амерыкі і свабодная Куба, далёкая Аўстралія і Еўропа, якая за апошняе паўстагоддзе двойчы станавілася крывавай арэнай сусветных войнаў.

Агрэсіўныя дзеянні імперыялістаў — сёння ў першую чаргу ў В'етнаме, Конга, Дамініканскай Рэспубліцы—сталі цэнтральнай тэмай Сусветнага кангрэса міру. Барацьба за захаванне міру ў нашы дні—гэта перш за ўсё барацьба супраць агрэсіі, барацьба супраць імперыялістычных авантур з боку вядучых заходніх дзяржаў на чале са Злучанымі Штатамі Амерыкі. Паўтары тысячы дэлегатаў Сусветнага кангрэса, якія сабраліся ў Хельсінкі, ставяць сваёй задачай давесці гэтую ісціну да свядомасці соцень мільёнаў людзей. І мусіць жа знамянальна, што першы дзень работы кангрэса быў аб'яўлены «Днём В'етнама».

У адрас кангрэса паступаюць прывітальныя тэлеграмы і пасланні ад дзяржаўных і палітычных дзеячоў, арганізацый і простых людзей розных краін.

Да ўдзельнікаў Сусветнага кангрэса за мір, нацыянальную незалежнасць і раззбраенне звярнуўся ў тэлеграме Старшыня Савета Міністраў СССР А. М. Касыгін. Савет Міністраў Саюза ССР, увесь савецкі народ, гаворыцца ў тэлеграме, горача вітаюць пасланцоў міралюбівых сіл усіх краін і кантынентаў. Сусветны кангрэс барацьбітоў за мір—буйная міжнародная грамадска-палітычная падзея. Яму трэба будзе абмеркаваць самыя актуальныя пытанні сучаснасці. Мір, нацыянальная незалежнасць і раззбраенне—гэта такія праблемы, дзеля вырашэння якіх нельга шкадаваць ніякіх намаганняў.

Сёння першарадны абавязак міралюбівых сіл, падкрэсліваецца ў тэлеграме, падтрымаць гераічны в'етнамскі народ у яго справядлівай і цяжкай барацьбе супраць агрэсіі ЗША.

Старшыня Савета Міністраў СССР пажадаў удзельнікам кангрэса поспеху ў выкананні высакароднай місіі служэння агульным інтарэсам народаў усёй зямлі.

Выключыць з жыцця чалавецтва вайну, абвузаць крайнія сілы імперыялізму і каланіялізму, з'яднацца для агульнай барацьбы супраць агульнага ворага—вось над чым у Хельсінкі днём, вечарам і нават, здараецца, уначы працуе Сусветны кангрэс міру. Яго ўдзельнікі, пасланцы самых розных народаў, падкрэсліваюць, што яны прыехалі сюды для таго, каб дамагчыся адзінства дзеянняў усіх сіл, якія выступаюць за захаванне міру.

Работа Сусветнага кангрэса працягваецца. Поспеху яго дэлегатам, перамогі яго ідэям!

ДРУЖБА І ЧАЛАВЕЧНАСЦЬ— ВЫШЭЙ ЗА ЎСЁ!

ЧАЦВЁРТЫ МІЖНАРОДНЫ КІНАФЕСТЫВАЛЬ 1965 МАСКВА

Закончыўся першы тыдзень работы IV Маскоўскага міжнароднага фестывалю. Конкурсныя экраны працуюць з поўнай нагрузкай. Цэнтрам фестывалю з'яўляецца, зразумела, Крамлёўскі Палац з'ездаў. Тут адбываюцца прагляды поўнаметражных фільмаў: штодзённа па тры, а то і чатыры карціны. Фестывальныя фільмы ідуць таксама ў многіх маскоўскіх кінатэатрах. У кінатэатры «Радзіма» ідуць польскія стужкі, у «Прагрэсе» —ГДР, у «Маскве»—Венгрыі і г. д.

Кінафестываль вельмі багаты ў жанравых адносінах. На ім дэманструюцца фільмы-аповесці і лірычныя апавяданні, стужкі псіхалагічныя. За апошнія дні члены журы і гледачы пазнаёміліся з фільмамі «Такі малады свет» (Алжыр), «Поруч» (Японія), «Дваццаць гадзін» (Венгрыя), «Дазвол на шлюб» (Балгарыя), «Хаціна дзядзі Тома» (ФРГ), «Рынак кветак» (Аргенціна), «Неба над галавой» (Францыя), «Сяброўства» (Індыя), «Прыгоды Вернера Хольта» (ГДР), «Шчаслівыя гульні» (Фінляндыя), «Памятай» (Ізраіль), «Белы маўр» (Румынія) і іншымі.

Венгерскі фільм «Дваццаць гадзін» рэжысёра Золтана Фабры складаны па сваёй форме. Здаецца, што рэжысёр наўмысна адмаўляе ўсялякую лёгкасць кінематаграфічнай пабудовы. Ён узнімае праблемы філасофскія, палітычныя, маральныя. У карціне расказваецца аб тым, як у венгерскую вёску прыязджае малады журналіст, каб напісаць пра таямнічае забойства селяніна. Ён гутарыць з рознымі людзьмі і ў выніку не можа напісаць рэпартаж—бо ў жыцці няма людзей толькі станоўчых або толькі адмоўных, як гэта прывыклі дзяліць журналісты. Кожны расказ селяніна — гэта маленькая навела. З такіх навелак і пабудавана ўся карціна.

Фільм Федэратыўнай Рэспублікі Германіі «Хаціна дзядзі Тома» пастаўлены рэжысёрам Гезе Радвані па добра вядомым чытачу рамане англійскай пісьменніцы Бічэр-Стоу. Гісторыя дзядзькі Тома і дзевяці яго таварышаў выкладаецца на экране на працягу трох гадзін, выкладаецца падрабязна, грунтоўна. Але фільм няроўны ў мастацкіх адносінах. Побач са сцэнамі яркімі, праўдзівымі сустракаюцца эпізоды, зробленыя вяла, сумна.

Асаблівае месца сярод фільмаў, якія выкрываюць фашызм, займае стужка рэжысёра Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі Іаахіма Кунерта. У ёй няма шырокага ахопу падзей, яна апавядае толькі пра аднаго героя. Мы не бачым тут канцлагераў, турмы, вылюдкаў-фашыстаў. Кінакамера пільна ўглядаецца ў жыццё, і тое, што яна бачыць, яшчэ больш страшнае. Мы знаёмімся з добрымі, сумленнымі юнакамі. Яны душэўна здаровыя, спакойныя. І гэта ў той час, калі іх краіна напярэдадні страшэннай трагедыі! Страшэнны лёс напаткаў галоўнага героя фільма Вернера Хольта.

Французскі рэжысёр Ів Чампі, вядомы нашым гледачам па фільму «Хто вы, доктар Зорге?», прадставіў на конкурс новы фільм «Неба над галавой». У ім ён імкнецца заглянуць у заўтрашні дзень, у той уяўны заўтрашні дзень, які можа прыйсці, калі атамныя краіны будуць варожа ставіцца адна да адной.

Фінскі фільм «Шчаслівыя гульні», пастаўлены маладымі рэжысёрамі Айто Мякіненам і Эска Эльстэля, складаецца з двух навел. Ён расказвае пра штодзённае жыццё звычайных людзей—пра новыя знаёмствы, сустрэчы, пра паездку ў вёску, пра дробязныя клопаты, сваркі і г. д. Зразумела, і на такім матэрыяле можна было б адкрыць нешта значнае, але ў фільме няма філасофскага асэнсавання падзей.

Ізраільскі фільм «Памятай», пастаўлены рэжысёрамі Філіпам Арцюісам і Ж. Л. Леві Альварэсам, паказвае судовы працэс над нацысцкім злачынцам Эйхманам, апавядае пра каханне людзей, якія сустрэліся яшчэ ў канцлагеры.

Адначасова з праглядам поўнаметражных фільмаў ідзе конкурс кароткаметражных. Прагледжаны ўжо стужкі Аўстраліі, Балгарыі, Бельгіі, Венгрыі, Ганы, Ісландыі і іншых краін.

На Маскоўскім фестывалі штодзённа адбываюцца творчыя сустрэчы, прэс-канферэнцыі. Многія дэлегацыі, чые фільмы былі паказаны, лічаць за абавязак сустрэцца з журналістамі.

Замежныя кінематаграфісты пазнаёміліся з работай буйнейшай кінастудыі свету—«Масфільмам». А 9 ліпеня пасля ранішніх прэс-канферэнцый у зале Цэнтральнага Дома літаратараў пачалася творчая дыскусія на тэму «Кіно і глядач».

Маскоўскі фестываль працягваецца. Наперадзе—новыя фільмы, новыя героі.

КІНАЛЕНІНІЯНА ПАПАЎНЯЕЦЦА

Пра гэтую падзею, што адбылася амаль шэсць дзесяцігоддзяў назад, нагадвае мемарыяльная дошка на фасадзе ціперашняга клуба чыгуначнікаў у Ленінградзе. І вось зараз быццам павярнулася кола часу — зноў гудзе натоўп у зале Народнага дома графіні Панінай, арыстакратыкі, якая гуляе ў лібералізм. Таксама расстаўлена мэбля, вісяць на сценах тыя ж партрэты — Пушкіна, Гейне, Шылера, Астроўскага. І таксама ў захапленні выбухае зала ў адказ на дакладныя, важкія словы невысокага чалавека ў кепачцы «Карпава». Перад масавай аўдыторыяй выступае Уладзімір Ільіч Ленін...

Мы расказалі пра здымкі аднаго з эпізодаў новага фільма «Праз ледзяную імглу», работа над якім ідзе на студыі «Масфільм». Рэжысёр-пастаноўшчык вядомы кінаператар Аркадзь Кальцаты, які дэбютуе сёння ў якасці рэжысёра.

Дзеянне гэтай карціны адбываецца ў вельмі цяжкі для партыі перыяд 1906—1907 гадоў. Гэта быў перыяд разгулу рэакцыі. Уся партыйная работа перамясцілася ў глыбокае падполле. Ленін знаходзіўся тады ў «блізкай эміграцыі» ў мястэчку Куоккала паблізу Пецярбурга на канспіратыўнай даче «Ваза». Глядач убачыць вядомы эпізод пераезду Леніна ў гарадок Або, калі, высачаны шпікамі, ён вымушаны быў на поўным ходу выскачыць з цягніка і зрабіць пераход зімовай ноччу па яшчэ неўмацаваным лёдзе Фінскага заліва на шведскі параход...

Аўтары фільма паставілі перад сабой задачу дамагчыся найбольшай гістарычнай дакладнасці, праўдзівасці. Праведзена вялікая работа па вывучэнні эпохі. З дапамогаю гісторыкаў аднаўляліся са скурпулёзнай дакладнасцю найдрабнейшыя дэталі жыцця, абстаноўкі, дзейнасці герояў фільма. Месцы здымак — сапраўдныя месцы падзей. Адзін з эпізодаў фільма здымаўся ў Ленінградзе, у былым кабінеце шэфа царскай паліцыі (цяпер там Дом вучоных), акцёры сядзелі за тым жа пісьмовым сталом, за якім было прынята рашэнне ад расстрэле дэманстрацыі 9 студзеня 1905 года. Захаваліся тоўстыя брانзавыя пліты, якія пасля націску кнопкі зачынялі вокны кабінета, на стале стаяў той жа самы малахітавы чарнільны прыбор і ляжала так званая «справа» Леніна, узятая з архіваў.

Вельмі складаным аказаліся здымкі пераходу Леніна па лёдзе Фінскага заліва. Спачатку на лодцы, спрытна вяслуючы паміж крыгамі, потым пехатою, правальваючыся ў палонкі, дубеючы на пякельным ветры, дабіраліся Ленін і шведскі рыбак Бергман да парахода. Старыя капітаны па памяці аднаўлялі лядовую абстаноўку тых гадоў, у лёдзе высякаліся спецыяльныя палонкі. Расчышчалі тоўсты пласт снегу, каб надаць лёду люстраную паверхню, ставілі ветрапальмухі.

— Нам здаецца, што нягледзячы на гады, што аддзяляюць нас ад часу дзеяння фільма, ён можа і павінен быць сучасны, — гаворыць Аркадзь Кальцаты. — Прынцыпы, якімі кіраваўся Ільіч, — яго дэмакратычнасць, калегіяльнасць у кіраўніцтве, адсутнасць позы, яго ўзаемаадносіны з таварышамі, чалавечнасць, прынцыповасць — усё гэта законы нашага сённяшняга дня.

Ролю Леніна іграе акцёр Юрый Каюраў з Саратава, які стварыў вобраз правадыра ў фільме «У пачатку стагоддзя».

У музычным афармленні фільма прымае ўдзел вядомы савецкі дырыжор — народны артыст СССР Натан Рахлін. Ён сам падабраў творы, якія павінны гучаць у фільме, — гэта і паэма Яна Сібеліуса «Фінляндыя», і Другі канцэрт для фартэпіяна з аркестрам Скрабіна. У фільме прагучыць музыка Бетховена і Чайкоўскага.

Алег БЛЯЎСКІ. (АДН).

ДЫСКУСІІ
На парадку дня:
ПРАБЛЕМЫ ДЗІЦЯЧАЙ ЛІТАРАТУРЫ

Ванкарэм НІКІФАРОВІЧ:

МАЛОМУ ПРЫНЕСЛІ НОВУЮ КНІЖКУ...

ЯК ТОЛЬКІ гаворка заходзіць пра дзіцячую мастацкую літаратуру, заўсёды падкрэсліваецца: яна мае выключнае выхаваўчае значэнне. Мы многа пішам і гаворым пра выхаванне дзяцей, пра ролю мастацкай літаратуры ў выхаванні і за шматлікімі правільнымі словамі і артыкуламі часам забываемся на сапраўдную важнасць, сур'ёзнасць гэтай праблемы...

Так, многія прызнаюць ужо — і сярод гэтых многіх не толькі тыя, каго гэта непасрэдна датычыцца, — што мастацкая літаратура ў агульным працэсе выхавання маладога пакалення робіць не менш значную справу, чым грамадскасць, школа, сям'я.

У наш час значна ўзрастае адказнасць тых, каму даручана выхоўваць наша маладое пакаленне, у тым ліку і адказнасць дзіцячых пісьменнікаў. Перад нашымі хлопчыкамі і дзяўчынкамі — самыя гуманныя, самыя цудоўныя ідэалы дабра і справядлівасці. Перад нашым грамадствам — высакародная і ў той жа час найадказнейшая мэта. Будучыня нашай Радзімы, нашай планеты, лёс міру на зямлі, лёс навукі, цывілізацыі і прагрэсу — усё гэта залежыць ад таго, як мы будзем выхоўваць нашых дзяцей.

І таму гаварыць пра творы сучаснай дзіцячай літаратуры трэба надзвычай сур'ёзна, з вялікім пачуццём адказнасці, падыходзячы да іх з не меншай, чым да твораў «для дарослых», патрабавальнасцю і прынцыповасцю.

НАША беларуская крытыка да гэтага часу сур'ёзна не займалася пытаннямі дзіцячай мастацкай літаратуры. У добры «ўраджайны» год выдаецца з дзесятак зборнікаў крытычных артыкулаў, але вы не знойдзеце ні ў адным з іх гаворкі аб праблемах сучаснай дзіцячай літаратуры. На старонках рэспубліканскага і абласнога друку амаль зусім не бывае гаворкі пра мастацкія творы для дзяцей. Рэдкія рэцэнзіі ў газеце «Літаратура і мастацтва» маюць часам апісальніцкі характар. Праблемы дзіцячай літаратуры павінны па-сур'ёзнаму ўсхваляваць і нашых вядомых крытыкаў. Пажадана было б, каб яны звярталіся да твораў дзіцячай літаратуры не толькі тады, калі ў іх поле зроку трапляе «ярка размаляваная старонка з часопіса», не старонка, «а проста «ад роднай галінкі дубовы лісток», якую да гэтага часу «быццам лёгкі вятрыска» насіў па хаце крытыка «з кута ў кут, са стала на канапу, на кнігі і зноў на стол» (гл. артыкул. Р. Бярозкіна «Адзін лісток», «ЛіМ», 19 сакавіка 1965 г.). Нельга пагадзіцца з такім падыходам да мастацкіх твораў для дзяцей, нават калі яны і надрукаваны ў часопісе.

Настаўнік Б. Зубкоўскі ў сваім артыкуле «Чым будуць абавязаны...» своечасова ўзняў вельмі надзённыя і сур'ёзныя пытанні развіцця беларускай дзіцячай мастацкай літаратуры. І нельга пагадзіцца з Ул. Жыжэнкам («Літаратура і мастацтва» за 29 чэрвеня 1965 г.), які абвінавачвае Б. Зубкоўскага ў нігілістычным падыходзе да сённяшняга дня нашай літаратуры, прыпісвае яму намер закрэсліць нашы дасягненні. Вопытны настаўнік, дырэктар школы проста шчыра падзяліўся сваім клопатам зацікаўленай асобы, да якой звяртаюцца ўвесь час маленькія чытачы, і не імкнуўся зрабіць справаздачны даклад секцыі дзіцячай літаратуры Саюза пісьменнікаў. Б. Зубкоўскі назваў прозвішчы вядомых пісьменнікаў не дзеля таго, каб скласці нейкі «спіс № 1», а проста каб падкрэсліць добрыя традыцыі ў нашай дзіцячай літаратуры.

Калі ж толькі пералічваць усе нашы дасягненні, як гэта робіць Ул. Жыжэнка, дык і не варта было б пачынаць гаворкі аб праблемах дзіцячай літаратуры. Не прадыктаваны сур'ёзным імкненнем прааналізаваць, ускрыць прычыны многіх пралікаў у дзіцячай літаратуры і спрэчны заклік Ул. Жыжэнкі рабіць «стаўку на тое, што сярод сотні кніг хутчэй... знойдзецца дзесятак пасапраўднаму добрых»... У размове аб літаратуры, аб майстэрстве, аб мастацкіх каштоўнасцях супроцьпаказаны і такі «сярэднеарыфметычны» падыход.

Такім чынам, першая неабходная прадпасылка для гаворкі аб праблемах дзіцячай літаратуры — гэта сур'ёзнасць і прынцыповасць аналізу, ацэнак, вывадаў.

Па-другое, мы часта забываемся на тое, што пра дзіцячую мастацкую літаратуру нельга гаварыць наогул, неканкрэтна, бо яна ніколі не ўяўляла сабой нейкую адзіную плынь, не была чымсьці ад-народным. Я маю на ўвазе перш за ўсё яе ўзроставую дыферэнцыяцыю. Дзіцячая літаратура падзяляецца на даволі самастойныя літаратуры па ўзростах, якім адрасаваны тыя ці іншыя творы. Гэты падзел, які ў «дарослай» літаратуры не мае такога значэння, вельмі істотны, спецыфічны. І таму прызнанне ўзроставай спецыфікі, адыход ад агульнага разгляду ўсёй дзіцячай літаратуры — гэта другая важная прадпасылка для гаворкі аб праблемах дзіцячай літаратуры.

ЯМУ ПРЫНЕСЛІ новую кніжку. Ён у цудоўным узросце — «ад двух да пяці», як сказаў Карней Іванавіч Чукоўскі. Паглядзіце, як ён возьме кніжку ў рукі, пабяжыць да маці і скажа:

— Мама, пачытай!

Звярніце ўвагу на яго вочкі: яны гараць незвычайным агнём радасці і цікаўнасці. А калі ён пачуе новыя добрыя вершы, дык радасці і захапленню ўжо няма і мяжы, дзіця забывае аб усім на свеце, ён увесь пад уладай чароўнага мастацкага слова. Яно адкрывае яму невядомы яшчэ, поўны цікавых здарэнняў і з'яў свет жывой і нежывой прыроды, свет чалавечага грамадства і велічных спраў чалавека, які пераўтварае ўсё на зямлі, яно вучыць малога — пакуль што слухача — думаць, разважаць, адчуваць, успрымаць прыгожае.

Асаблівай радасці адкрыцця новага чакаюць заўсёды маленькія чытачы і слухачы ад паэтычнай кніжкі. У паэта, які піша вершы для самых маленькіх, вельмі незвычайны чытач: ён, уласна кажучы, і чытаць яшчэ не ўмее. Мастацкі твор успрымаецца ў такім узросце на слых, дзеці вельмі лёгка запамінаюць вершы, і паэтычнае слова пераходзіць у слоўнікавы запас дзіцяці. Пры гэтым вельмі важна, каб дзеці пачулі твор, які вызначаецца высокімі мастацкімі якасцямі і непарыўным адзінствам формы і зместу. Бо з гэтага, акрамя ўсяго, пачынаецца і сапраўднае эстэтычнае выхаванне.

У беларускай паэзіі для самых маленькіх ёсць свае выдатныя традыцыі і дасягненні. Варта толькі сказаць, што «Алеся» і «Хлопчык і лётчык» Янкі Купалы перакладзены на многія мовы свету, што сталі хрэстаматыйнымі і ўвайшлі ў скарбніцу вялікай літаратуры народаў СССР многія вершы для дзяцей Я. Коласа, М. Танка, П. Броўкі, В. Віткі, М. Лужаніна і іншых нашых вядомых паэтаў. Цікава адзначыць, што заслужаны поспех чакаў гэтых і іншых аўтараў тады, калі яны проста і шчыра размаўлялі з маленькімі чытачамі, знайшоўшы патрэбную інтанацыю, размаўлялі аб падзеях і з'явах вельмі сур'ёзных, нават пэўнага грамадскага гучання. Мне здаецца, адной з лепшых кніжак апошніх год у гэтых адносінах з'яўляецца «Учора, сёння і заўжды» Уладзіміра Корбана. Паэт лаканічна і вобразна расказвае дзецям пра розныя прафесіі. Невялічкія нізкі так і называюцца: «Аб прафесіях, якія зніклі», «Аб прафесіях, якія знікнуць», «Аб прафесіях, якія ніколі не знікнуць», «Аб новых прафесіях». Кніжка робіць сваю карысную справу. На жаль, яна была выдадзена на кепскай паперы, вельмі малым тыражом (8000 экз.) і ў няўдалым, аляпавата-прымітыўным афармленні мастака В. Варанецкага.

Сярод самых апошніх кніжак вылучаюцца спробай гаварыць сур'ёзна і проста пра важнае зборнікі Віктара Шымука «Дочкі сіняга Нёмана» і Генадзя Кляўко «Першы салют». У першай паэт імкнецца па-мастацку вытлумачыць назвы нашых рэк. Зусім натуральна, без нуднай павучальнасці, В. Шымук смела ўводзіць у вершы звесткі з эканамічнай геаграфіі і з гісторыі роднага краю. Генадзь Кляўко ў кнізе для маленькага чытача звярнуўся да тэм гераізму дзяцей у часы вайны, патрыятызму, любві да роднага краю, любві да працы. Вершы «Андрэйка» і «Марынка» са зборніка «Першы салют» цікавыя якраз адсутнасцю дыдактыкі, паэт не «націскае» на сваіх герояў — яны самі прымаюць правільнае рашэнне, і ім верыш.

Але яшчэ вельмі часта нашы паэты гавораць з малымі агульна, суха, абыякава. А слабы твор не толькі не выхоўвае, дзеці яго проста не заўважаць і не запомняць, бо ім уласціва толькі канкрэтна-вобразнае мысленне.

Мала даюць розуму і сэрцу дзіцяці даволі пасрэдныя рыфмаваныя замалёўкі, пабудаваныя на выпадковасцях. Вось, напрыклад, верш Н. Галіноўскай «Снегірок» са зборніка «Давайце пазнаёмімся»:

На рабінавы сучок
Сеў чырвоны камячок.
Страсянулі мы рабіну —
Паляцеў ён на каліну.
Здагадаўся Васілёк:
— Гэта птушка снегірок!

Акрамя таго, што тут адсутнічае паэтычнае бачанне з'явы, вершу нестае і звычайнай логікі: выходзіць, што Васілёк здагадаўся, як завецца птушка таму, што калі страсянулі рабіну, яна паляцела на каліну.

Але ўдалы выбар тэмы для дзіцячага верша сам па сабе яшчэ не забяспечвае поспеху твору. Вельмі важна знайсці правільную інтанацыю ў размове з маленькім чытачом, каб не быць мэнтарскі-надакучлівым, з аднаго боку, альбо халодна-бясстрасным, эмацыянальна-нейтральным, з другога. Трэба заўсёды ўлічваць, што дзеці вельмі востра адчуваюць непасрэднасць і фальшывую інтанацыю, праўду і няпраўду, шчырасць і спробу схлусіць.

Новы зборнік вершаў для самых маленькіх Еўдакіі Лось «Вяселікі» пакідае значна лепшае ўражанне, чым яе папярэднія дзіцячыя кніжкі. Многія вершы ў гэтай кніжцы прасякнуты сапраўдным гумарам, выдумкай, значна вырасла ў паэтэсы і мастацкая культура вершаванага радка. Аднак і ў гэтым зборніку ёсць вершы, дзе Е. Лось, імкнучыся да шчырай інтанацыі ў размове з самымі маленькімі, не заўсёды знаходзіць яе. У выніку — непатрэбнае «сюсюканне», падробка пад дзіцячую мову («Зайчык-пагуляйчык», «Юлька-зязюлька») альбо празмерная спрошчанасць, як у вершы «Горад»:

Шмат палацаў і дамоў.
Электрычных шмат агнёў.
Вуліц новенькіх без ліку
І тралейбусаў вялікіх.
Магазінаў шмат такіх,
Дзе цукеркі для малых.
Шмат і фабрык, і заводаў.
На заводах —
Шмат народу.

Гэта і ўвесь верш. Зарыфмаваная канстатацыя агульнавядомага наўрад ці зможа па-сапраўднаму пашырыць кругагляд дзіцяці. Так і незразумела: што ж хацела сказаць гэтым творам паэтэса?

А тут вось, наадварот, думка занадта падкрэслена, нават абыграна, але абыграна ізноў не ў інтанацыі верша для самых маленькіх:

БРАТОК
— Ма-ма,
Ба-ба, —
Крычыць браток.
А болей — ані слоўца!
Жартуе тата:
— Што ж, каток, —
Быць табе прамоўцам!

Мне здаецца, тут Е. Лось занадта «сур'ёзна» пажартавала разам з тым татам, ды і сам жарт, нават калі ён разлічаны на дарослых, не вельмі трапны.

Безумоўна, нельга адмаўляць спецыфіку мовы дзіцячай літаратуры, але разумець яе трэба правільна. Дзеці не прымаюць розныя падробкі пад так званую «дзіцячую» мову. Пісьменнік павінен гаварыць з дзецьмі як роўны з роўнымі, але зразумела, ясна. Можна бачыць свет вачыма дзіцяці, але абавязкова з вышыні свайго паэтычнага далягляду.

Афарыстычнасць, сапраўдная сціпласць, выдумка, нечаканы паварот, вясёлая ўсмешка — вось што заўсёды прываблівае чытача, робіць верш запамінальным. Напрыклад, у вясёлым вершы «Востры язычок» са зборніка І. Шуцько «Першае слова» ёсць і добрая ўсмешка, і ігра пераносным значэннем слова. І побач у таго ж аўтара другі, абыякавы, халодны верш, з ненатуральнай, надуманай канцоўкай:

ЛІПКІ
Восенню рабяты
Ліпкі пасадзілі,
Чыстаю вадою
Іх штодня паілі.
А вясною з кожнай
Ружаватай почкі
Выпырхнулі дружна
Клейкія лісточкі.
Сонейка ласкава
Дрэўцы цалавала.
З імі кадя дома
Весялей нам стала.

Амаль усё тут правільна, а вось каб сапраўды дзецям стала «весялей», — у гэта нешта не верыцца. Не стане весялей чытачам ад такога сумнага верша, дзе зусім не адчуваецца настрой нашых сённяшніх дзяцей.

У ПАЭТА, які піша для дзяцей, канкрэтна-вобразнае мысленне таксама павінна быць не проста на ўзроўні самых сучасных уяўленняў, а ў некаторай ступені прыўзнімацца, заглядаць у будучыню, апераджаць сучасныя нор-

(Заканчэнне на 3-й стар.).

Новыя мікрараёны з'яўляюцца ў горадзе Барысаве. Каб зжывіць манатонны сілуэт, архітэктары прапанавалі пастаўіць дамы новага тыпу. Шмат даводзіцца працаваць інжынерам і тэхнікам, якія «прывязваюць» тыпавыя праекты. На гэтым здымку вы бачыце інжынера Л. Фурмана, тэхніка-архітэктара А. Пішчалава, інжынера-канструктара Г. Адзінцову, супрацоўнікаў барысаўскай майстэрні «Белдзяржпраекта», якія абмяркоўваюць па макета горада пытанні забудовы.

Фота А. ЦЕРЛЮКЕВІЧА (БЕЛТА).

КЛІЧУЦЬ НЕПРАТАПТАНЫЯ СЦЕЖКІ

Алесь МАХНАЧ

Сёння ў турысцкім паходзе па месцах баявой славы знаходзяцца сотні тысяч піянерскіх атрадаў і дружын нашай краіны.

Недзе на Брэстчыне ў гэтым паходзе крочаць і юныя гісторыкі Чарнаўчыцкай сярэдняй школы. Іх вядзе выкладчык гісторыі Іван Іосіфавіч Кулеша.

А яшчэ два гады назад, калі Іван Іосіфавіч прапанаваў сваім вучням пайсці ў паход па роднаму калгасу, дык многія абыякава ўсміхнуліся, пачалі пярэчыць: што мы цікавае ўбачым — у нас няма ні герояў, ні памятных мясцін, пра якія ў кніжках пішуць. Тады настаўнік запытаўся:

— Хто з вас, дзеці, можа расказаць пра першых піянераў, камсамольцаў і арганізатараў нашага калгаса?

Пэўнага адказу ніхто не даў. Але ўсіх зацікавіла: хто ж быў першым?

У пошуках гістарычных звестак аб родным краі, яго людзях вучні правялі лета. Яны заходзілі ў кожны дом, гутарылі з людзьмі. Сшыткі, блакноты запаўняліся ўсё новымі і новымі запісамі легенд, казак, паданняў і жывых успамінаў. Калекцыя юных гісторыкаў папоўнілася нават знаходкамі з раскопак гарадзішча «Покры»: прадметамі хатняга быту, упрыгожаннямі, гліняным посудам. Гэтыя рэчы давалі ўяўленне аб жыцці і працы далёкіх продкаў.

Але асабліва вялікую цікавасць у школьнікаў выклікалі рэвалюцыйныя, баявыя і працоўныя подзвігі аднавяскоўцаў.

Напрыклад, з Мікалаем Носікам вучні сустракаліся амаль кожны дзень. Гэты сціплы калгаснік — удзельнік штурму Берліна, за мужнасць і гераізм узнагароджаны многімі баявымі ордэнамі і медалямі.

— Дык чаму ж вы маўчалі дагэтуль? — наперабой пыталі вучні М. Носіка.

— Ды хіба я адзін такі ў нашай вёсцы, — адказаў калгаснік.

Аказалася, што многія аднавяскоўцы змагаліся на фронце, у радах народных мсціўцаў, адзначаны ўрадавымі ўзнагародамі. Юныя краязнаўцы запісалі ўспаміны і другога ўдзельніка баёў за Берлін—Я. Тромзы, удзельніка вызвалення Вены і Будапешта С. Клімука, многіх былых франтавікоў і партызан, а таксама ўдзельнікаў рэвалюцыйна-вызваленчага руху 1920—1939 гг. на тэрыторыі Чарнаўчыцкага сельскага Савета.

Дакументы, літаратуру і падпольны друк аб барацьбе людзей супраць белапольскай акупацыі, транспаранты і шматлікія фотаздымкі таго часу, лістоўку, прысвечаную подзвігу М. Носіка, якую выпусціла ў гады вайны франтавая друкарня,—усё збіралі юныя гісторыкі. Гэтыя рэліквіі баявой і рэвалюцыйнай славы знайшлі сваё пастаяннае месца ў школьным краязнаўчым музеі.

Расказ аб гісторыі роднага калгаса вучні пачалі з афармлення экспазіцыі «Старажытнае паселішча Покры» і закончылі яго выстаўкай вянанак жыта, пшаніцы, ячменю, аўса, клубняў бульбы, буракоў... Тут жа побач — партрэты перадавых хлебаробаў, якія атрымалі высокі ўраджай гэтых сельскагаспадарчых культур.

Школьнікі напісалі гісторыю Чарнаўчыц, Амельна, Блювініч, Покры, Холміч, Малай Кураніцы і іншых населеных пунктаў. Дзевяць альбомаў складае гэты летапіс. Ён папаўняецца новымі матэрыяламі. Нядаўна ў музей паступілі ордэны Працоўнага Чырвонага Сцяга, «Знак пашаны» і многія медалі, якімі быў узнагароджаны за шматгадовую і сумленную працу калгаснік Аляксандр Філіпяк. Ён памёр некалькі гадоў назад, але слава гэтага сціплага чалавека жыве ў памяці людзей. У школе ўсе ведаюць пра баявыя і працоўныя подзвігі сваіх дзядоў, бацькоў, старэйшых братоў і сясцёр. Тут «нішто не забыта, ніхто не забыты».

У музеі часта праводзяцца заняткі па гісторыі і геаграфіі. Гэта дае магчымасць вучням лепш засвойваць праграмны матэрыял, падмацоўваць яго канкрэтнымі мясцовымі фактамі.

Калі я знаёміўся з экспанатамі гэтага музея, ужо не мог уявіць урок настаўніка адарваным ад гісторыі школы, дзе сядзяць на занятках вучні, ад гісторыі вуліцы, па якой дзеці штодзень ходзяць, горада ці вёскі, дзе яны нарадзіліся і жывуць.

Думаў я і пра тое, што часам настаўнікі не могуць накіроўваць юных гісторыкаў на цікавыя пошукі, на тыя пошукі, што не ўваходзяць у абавязковую вучэбную праграму вучняў. Я тут маю на ўвазе стварэнне краязнаўчых музеяў і куткоў. На жаль, яны сёння ёсць далёка не ў кожнай школе. Больш таго, у шмат якіх школах не ўбачыш нават партрэтаў былых вучняў, якія сёння сталі ўдарнікамі камуністычнай працы, наватарамі вытворчасці, перадавікамі сельскай гаспадаркі, вучонымі, выдатнымі воінамі і афіцэрамі Савецкай Арміі, не ўбачыш партрэтаў былых выпускнікоў школы, якія вызначыліся ў баях за Радзіму.

Вельмі шкада, што многія краязнаўчыя гурткі захапляюцца паходамі толькі па агульнавядомых гістарычных мясцінах, збіраюць і запісваюць успаміны ўжо даўно «адкрытых» герояў і зусім нічога не ведаюць пра мінулае роднай школы.

У 7-й сярэдняй школе г. Мінска стварылі два музеі: абароны Брэсцкай крэпасці і Ю. Гагарына. На іх адкрыццё запрасілі вядомых ветэранаў Айчыннай вайны, а таксама аўтара гэтых радкоў. Госці павялі з вучнямі адкрытую і шчырую размову: ці патрэбна краязнаўцам хадзіць па пратаптаных сцежках і адкрываць тое, пра што многа напісана ў кнігах, расказана па радыё, паказана па тэлебачанні. Ці з'яўляецца ўсё гэта самастойнай працай юных гісторыкаў? І дзеці ўлічылі слушныя парады сваіх гасцей. Сёння тут збіраюцца матэрыялы, якія складуць летапіс роднай школы, раскажуць пра знатных людзей.

У гэтыя дні, калі ідзе Усесаюзны турысцкі паход па месцах баявой славы, абаронцы Брэсцкай крэпасці атрымліваюць шмат пісем ад юных краязнаўцаў. Яны ідуць са школ Масквы і Ленінграда, Урала і Сібіры, Далёкага Усходу і Сярэдняй Азіі, Каўказа і Украіны. Ёсць шмат пісьмаў і ад беларускіх дзяцей. Яны пішуць, што ўключыліся ва Усесаюзны турысцкі паход. Вось некаторыя радкі з гэтых пісьмаў: «Камсамольцы нашай школы вырашылі стварыць музей абароны Брэсцкай крэпасці», «Нашаму піянерскаму атраду даручана знайсці і наладзіць перапіску з героямі цытадэлі над Бугам», «Абаронцам крэпасці-героя прысвячаем фотавыстаўку альбом...», і ў кожным пісьме просьба выслаць успаміны, фота...

Герой Савецкага Саюза П. Гаўрылаў, абаронцы Брэста С. Матэвасян, П. Клыпа расказваюць, што кожны з іх штодзень атрымлівае па сто і больш пісьмаў. Як тут адказаць на кожную просьбу!

Нядаўна супрацоўнікі музея Брэсцкай крэпасці пазнаёмілі мяне з вялізным стосам свежай карэспандэнцыі, якую толькі што прынесла пошта. У кожным канверце просьба: выслаць цагліны, якія плавіліся ад стрэлаў варожых агнямётаў, выслаць асабістую зброю абаронцаў, знойдзеную ў час раскопак, выслаць дакументы і каштоўныя рэліквіі — увогуле ўсё неабходнае для адкрыцця музея. Перапіска з дзецьмі забірае ў навуковых супрацоўнікаў шмат часу. А пісьмы працягваюць ісці патокам, ідуць нават са школ, якія знаходзяцца па суседству адна з адной.

Ніхто, вядома, не супраць школьных музеяў Брэсцкай крэпасці. Толькі навошта, скажам, у адным і тым жа горадзе ці раёне адкрываць адразу некалькі музеяў, прысвечаных адным і тым жа падзеям, адным і тым жа героям, калі дастаткова было б мець толькі адзін, але змястоўна і цікава афармлены, каб ён стаў свайго роду філіялам таго ці іншага дзяржаўнага музея, а юныя гісторыкі — пазаштатнымі памочнікамі яго навуковых супрацоўнікаў.

У такім напрамку і вядзецца работа музея 7-й Мінскай школы-інтэрната (вуліца Тарханава, 20). Тут піянеры атрада імя Пеці Клыпы сабралі багаты матэрыял. Вучні зрабілі свой музей філіялам музея крэпасці-героя. Многія мастакі і скульптары перадалі вучням свае творы, удзельнікі абароны прыслалі ўспаміны, фотаздымкі. Па афармленні музея шмат зрабіў мастак П. Дурчын. Пра гэты музей ведаюць у многіх школах Мінска і вобласці, сюды часта наладжваюцца экскурсіі.

Хочацца, каб у школах Мінска былі музеі, прысвечаныя подзвігам Герояў Савецкага Саюза М. Кедышкі, Я. Клумава, Марата Казея, Ул. Амельянюка, І. Казінца, І. Кабушкіна, музеі аб подзвігах падпольшчыкаў Обалі і Скідэля, Жлобіна і Магілёва... За кожным з гэтых імёнаў і назваў стаяць дзесяткі і сотні патрыётаў, іх баявыя справы. Наша зямля надзвычай багатая героямі. Беларускі дзяржаўны музей Айчыннай вайны, вядома ж, не мае магчымасці прысвяціць кожнаму слаўнаму подзвігу, якімі багата рэспубліка, асобную экспазіцыю. Значная частка каштоўных рэліквій гадамі ляжыць у яго запасніках. А чаму б іх не перадаць юным краязнаўцам?

За апошні час юныя гісторыкі рэспублікі значна актывізавалі сваю работу. У школах адкрываюцца музеі самых розных профіляў — краязнаўчыя, рэвалюцыйнай, баявой, камсамольскай славы, літаратурныя, музеі, прысвечаныя жыццю і дзейнасці Ул. І. Леніна.

Летась выхаванцы Ляхавіцкага дзіцячага дома звярнуліся ў Маскву да супрацоўнікаў Дзяржаўнага музея Ул. І. Леніна, каб тыя дапамаглі ім стварыць у школе музей, прысвечаны вялікаму правадыру. Дзеці паведамілі, што хочуць зрабіць свой музей цэнтральным у раёне, абавязаліся арганізоўваць сюды экскурсіі вучняў, калгаснікаў, рабочых, служачых. Такія ж пісьмы выхаванцы дзіцячага дома паслалі ў Ленінград, Ульянаўск, Казань, Шушанскае, Варшаву, Лейпцыг, Чэхаславакію. З ленінскіх музеяў былі атрыманы шматлікія каштоўныя рэліквіі.

Набліжаецца 100-годдзе з дня нараджэння Ул. І. Леніна. Гэтую вялікую дату будуць адзначаць усе савецкія людзі, усё прагрэсіўнае чалавецтва свету. І органам народнай асветы трэба падтрымаць ініцыятыву стварэння ў кожным раёне і горадзе цэнтральнага ленінскага музея, які змог бы больш шырока і паўней расказаць людзям пра жыццё і дзейнасць вялікага правадыра працоўных.

На Полаччыне ў Астроўшчынскай сярэдняй школе пачаў працу літаратурны музей. У экспазіцыі—шматлікія выданні кніг беларускіх пісьменнікаў, іх аўтабіяграфіі, рукапісы твораў, аўтографы, фотапартрэты. Пазнаёміцца з экспанатамі музея прыходзяць калгаснікі і вучні навакольных вёсак. Многія пісьменнікі ведаюць пра існаванне гэтага музея, аказваюць яму дапамогу.

Усё гаворыць за тое, што праца юных гісторыкаў патрабуе сваёй каардынацыі. Асабліва ў адкрыцці школьных музеяў, прысвечаных вядомым гістарычным падзеям. Вопыт паказвае, што вучні могуць стаць пазаштатнымі супрацоўнікамі дзяржаўных музеяў, адкрываць невядомыя старонкі баявой і працоўнай славы нашых людзей. І органам народнай асветы варта падумаць над тым, каб юныя гісторыкі не дубліравалі ў сваёй працы тое, што ўжо адкрылі іншыя, а ішлі сваімі непратаптанымі сцежкамі.

У майстэрнях мастакоў

СААЎТАР РЭЖЫСЁРА

Я патрымаў у руцэ «стол» са спектакля «Прэс-аташэ ў Токіо», ненальні крэслаў, піяніна, кніжную шафу... На мінуту ўявіў сабе, як цікава было б убачыць усё гэта гледачам, напрыклад, перад пачаткам спектакля. І зноў пачаў даставаць са скрынак самыя розныя і нечаканыя рэчы... Многія з іх ужо знаёмыя—я бачыў іх на сцэне Гомельскага абласнога драматычнага тэатра.. Створаны яны Віктарам Грышыным.

Памятаю, неналі мы доўга гаварылі з ім пра тэатральную афішу, пра тое, што рабіць яе павінен сам мастак, які афармляе спектакль, бо толькі ён можа лаканічна і дакладна перадаць ідэю п'есы. У Гомелі ж гэта часта робяць людзі выпадковыя, і таму афішы бываюць бледныя і невыразныя.

Чуў я выступленні Віктара Грышына на абмеркаваннях спектакляў народных тэатраў. Бачыў яго нават на сцэне—у інтарэсах тэатра ён не толькі афармляў спектаклі, але і станавіўся акцёрам. Бачыў яго работы на абласной мастацкай выстаўцы...

Але з вока на вока сустрэўся з ім упершыню.

Нягучна спявае ў пакоі прыёмнік.

— Пад музыку лепш думаецца і працуецца,— гаворыць Віктар.

Мой прыход адарваў яго ад занятку. Бачу гэта і стараюся не адбіраць у мастака шмат часу. Ён, наадварот, нетаропка паказвае работы, падрабязна расказвае пра іх. І хутка я пачынаю разумець, што грунтоўнасць і дакладнасць—рысы яго характару, што нічога ён не робіць наскокам.

...Сцэны завешаны эскізамі тэатральных дэкарацый і касцюмаў, эцюдамі. Шмат у пакоі вырабаў з дрэва—ваза на тэлевізары, пацеркі, мініяцюрная мэбля. І гэта не выпадкова. З дрэвам звязаны пачатак творчай біяграфіі Віктара Грышына. Пасля заканчэння ў Ленінградзе архітэктурна-мастацкага вучылішча ён працаваў чырвонадрэўшчыкам. Маляваць пачаў, як ён гаворыць, позна, аднак захапленне тэатрам — даўняе. У арміі Грышын кіраваў драматычным гуртком, сам шмат іграў. Думаў—будзе акцёрам. Дэмабілізаваўся, паступіў у Ленінградскі інстытут тэатра, музыкі і кіно. Педагогі адкрылі ў ім здольнасці мастака, уменне шукаць і знаходзіць арыгінальныя кампазіцыйныя рашэнні, адчуванне колеру. Пяць гадоў вучобы ў народнага артыста БССР М. Акімава, заслужанага дзеяча мастацтваў РСФСР Т. Бруні і іншых вядомых педагогаў, абарона дыплома на выдатна...

«Будзь заўсёды такі ж старанны ў рабоце, як цяпер, тады напэўна будзеш шчаслівы», — напісала яму на адной са сваіх работ Т. Бруні. З такім наказам і прыехаў тры гады назад В. Грышын у Гомель.

З адзінаццаці спектакляў, афармленых В. Грышыным у Гомельскім тэатры, ніводзін не падобны на другі. Не захапляючыся вонкавымі эфектамі, мастак імкнецца стаць паўнапраўным саўтарам рэжысёра, памагчы акцёрам паўней і глыбей раскрыць характары герояў.

Пошук у В. Грышына пачынаецца задоўга да таго, як першая лінія алоўкам ці першы мазок пэндзалем кладзецца на аркуш ватмана. Сама п'еса, літаратура пра яе і пра драматурга, кнігі па гісторыі (калі дзеянне адбываецца не ў нашы дні), потым шматлікія «чыркушкі», якія нагадваюць кінакадры, бясконцыя гутаркі і часта спрэчкі з пастаноўшчыкам. Калі бывае асабліва цяжка, ён садзіцца ў цягнік і едзе ў Ленінград, у свой інстытут, да сваіх педагогаў: паказвае ім эскізы, раіцца, днямі праседжвае ў бібліятэцы. Так было, напрыклад, калі В. Грышын афармляў самыя цяжкія для яго спектаклі — «Тэўе-малочнік», «Жадле ці гаспадар-слуга», «Прэс-аташэ ў Токіо». Ад кожнай такой паездкі застаецца памяць — кнігі, фатаграфіі, уражанні аб ленінградскіх прэм'ерах, парады настаўнікаў.

Віктар Грышын працуе шмат. Не ўсім ён пакуль сам задаволены. «Тэўе-малочніка», напрыклад, цяпер ён аформіў бы інакш і, напэўна, лепш. А вось у «Прэс-аташэ ў Токіо» напрамак быў узяты правільны: афармленне памагае акцёрам іграць (гэта мне гаварылі самі акцёры), а гледачам—лепш разумець спектакль (гэта я ведаю па сабе). Прэм'еры гэтых спектакляў адбыліся даўно, але В. Грышын не перастаў думаць аб іх.

Сёння ў яго такая цікавая і захапляючая работа, пра якую ён даўно марыў. Віктар Грышын прыступіў да афармлення спектакля па раману І. Шамякіна «Сэрца на далоні» — гэта будзе, відаць, першая прэм'ера новага сезона. Часу—у абрэз, а работы—непачаты край.

Аркушы ватмана, алоўкавыя накіды, маленькія «чыркушкі»... Побач — разгорнуты раман І. Шамякіна. Работу, якую ён зараз робіць, мастак лічыць самай сур'ёзнай і адказнай за ўсю сваю творчую біяграфію. Іменна таму ён цяпер асабліва патрабавальны да сябе, таму па шмат разоў перарабляе эскізы дэкарацый. Па першым варыянце пастаноўшчык заслужаны дзеяч мастацтваў БССР Ю. Арынянскі і мастак вырашылі, што афармленне павінна быць мяккае, нібы акварэльнае. Потым, калі яшчэ раз уважліва перачыталі раман, прыйшло іншае рашэнне — зрабіць афармленне скупое і нават рэзкае. У творы—сутыкненне двух светапоглядаў: кампрамісу паміж імі быць не можа. Адсюль, вырашылі пастаноўшчыкі, скупасць і рэзкасць, адсюль—і імкненне максімальна сканцэнтраваць зрокавую ўвагу на дзеяннях герояў. У сцэнах спектакля (іх усяго дваццаць пяць) заняты па два-тры акцёры, на вялікай прасторы сцэны іх фігуры могуць здавацца дробнымі, будуць губляцца. Мастак і рэжысёр улічылі гэта. У чорным партале прарэзаны экран, рамка якога нібы абмяжоўвае месца дзеяння. На фоне партала аплікацыямі выкананы абрысы тэлевізійнай вышкі, вежы фабрыкі імя 8 Сакавіка — пастаноўшчыкі вырашылі быццам перанесці дзеянне ў Гомель. Гэта падкрэслівае і пачатковая застаўка — плошча, славуты гомельскі парк, помнік Ул. І. Леніну. Дарэчы, такой жа застаўкай спектакль і закончыцца; і ў гэтым таксама сцвярджэнне асноўнай думкі твора — ленінскія нормы жыцця перамагаюць.

Падзеі ў спектаклі развіваюцца ў двух вымярэннях—у нашы дні і ў мінулым. Звычайна, дэкарацыі сённяшняга дня робяцца манументальнымі, мінулае—пасля зацямнення або за лёгкім заднікам. В. Грышын пайшоў па іншаму шляху. Нашым дням адпавядае светлы, лёгкі, мажорны тон. Сцэны ўспамінаў — наплываюць з глыбіні—будуць ёмістыя, фундаментальныя, таму што мінулае, урываючыся ў сённяшні дзень, абавязкова аказвае на яго свой уплыў. Кожнаму эпізоду спектакля будзе адпавядаць свой дыяпазітыў, спраектаваны на заднік.

Цяпер, нягледзячы на тое, што макет спектакля пачынае ўжо ўвасабляцца, В. Грышын працягвае пошук. Я бачыў эскізы, накіды, «чыркушкі», іх сабралася шмат, але стос увесь час расце.

Пошук не канчаецца.

Д. РАДЗІНСКІ.

Эскіз дэкарацыі мастака В. Грышына да спектакля «Не было ні грошаў, ды раптам алтын».

ФІЛІЯЛ КНІГАРНІ ПРЫ БІБЛІЯТЭЦЫ

Савет па камплектаванню сельскіх, калгасных, саўгасных і школьных бібліятэк працуе пры Глыбоцкай раённай бібліятэцы. Ён быў створаны шэсць год назад. У яго ўвайшлі партыйныя работнікі, спецыялісты сельскай гаспадаркі, урачы, выкладчыкі літаратуры, актыўныя чытачы.

У мінулым годзе па рашэнню савета пры раённай бібліятэцы быў адкрыты філіял кнігарні, у якім чытачы могуць купіць творы савецкай і зарубежнай літаратуры. Летась філіял магазіна прадаў кніг на 730 рублёў. Сёлета за першае паўгоддзе тут было рэалізавана літаратуры на 540 руб.

В. ТРУС.

Спяваць Оля Валчкова пачала яшчэ ў школьныя гады. Зараз Оля навучэнка Мінскага прафесіянальна-тэхнічнага вучылішча № 13 і ўвесь час яна не расстаецца з песнямі. У рэпертуары спявачкі многа песень беларускіх кампазітараў. На заключным канцэрце ўдзельнікаў мастацкай самадзейнасці працоўных рэзерваў Беларусі, які нядаўна адбыўся ў Мінску, Оля з поспехам выканала некалькі песень.

Фота Ул. КРУКА.

Тэатр

І ГЭТА — ПРА КАХАННЕ?..

Георгій КОЛАС

Калі вы чуеце, што недзе ў бярозавым гаі сабраўся мільярд гракоў, якія «так равуць, нібыта ў іх цэлы дзень ідзе мясцком», ваша ўяўленне малюе вясёлую карціну, поўную гукаў і пахаў прадвесня.

А мільярд варон?

Метафара з мясцкомам адразу набывае афарбоўку прынцыпова іншую.

Не ведаю, адкуль у Артура Вольскага, перакладчыка п'есы «Сто чатыры старонкі пра каханне» Э. Радзінскага, узяліся вароны. Магчыма, ён меў перад сабой не той варыянт п'есы, які вядомы нам па публікацыі часопіса «Театр». Магчыма, у тым варыянце, акрамя варон, былі таксама настойлівыя аўтарскія ўказанні аб вынасе памыйных вёдраў пры абмеркаванні лёсу Наташы Аляксандравай яе суседзямі і адносна бутэлек з-пад спіртнога, якія збірае з-пад лавак у сцэне заапарку вартаўнік. Магчыма, там былі і не вельмі смачныя рэмінісцэнцыі Вясёлага грамадзяніна пра Фауста і Маргарыту, пасланыя ўслед Электрону і Наташы з «сучасным» каментарыем: «Як нехта павёў кагосьці».

Так, магчыма, у аўтара быў і такі варыянт п'есы.

І ўсё ж незразумела, чаму купалаўцаў прывабіў менавіта ён.

Незразумела, што зацікавіла купалаўскі тэатр у тых героях, **якімі ён іх бачыць**, якімі іх **паказвае** са сцэны.

У газеце «Літаратура і мастацтва» 25 чэрвеня Уладзімір Мехаў пісаў пра свае ўражанні ад пастаноўкі «Ста чатырох старонак» у Гомельскім тэатры. Я цалкам падзяляю яго захапленне творам, рэжысёрскай трактоўкай Ю. Арынянскага і толькі хачу дадаць, што мой калега, як мне здаецца, недаацаніў работу выканаўцы галоўнай ролі артысткі М. Куклінай. Ён гаворыць, што вобразу яе Наташы Аляксандравай нібыта нестае пэўнай думкі. А думка ёсць. Натхнёная, змястоўная. І трэба яе раскрыць, бо гэта дапаможа нам і ў размове аб купалаўскім спектаклі.

М. Кукліна рашуча адкідае замацаваную за гераіняй Эдварда Радзінскага рэпутацыю дзяўчынкі з імклівымі палюбоўнымі рытмамі. Не лёгкадумнасць звяла яе Наташу з Электронам, а спадзяванне на «незвычайную сустрэчу». Яна—рамантык, і заўсёды прагне вялікага, чыстага, сапраўднага. Дарма, што аднойчы, як яна сама кажа, ёй «прапаліла абшывачку». Ад гэтага Наташа не страціла ні жыццялюбнасці, ні сваёй веры ў чалавека. Нават скептычны анекдот Вясёлага грамадзяніна аб тым, што «вялікае, чыстае, сапраўднае» — гэта ўсяго толькі «слон, памыты ў ванне»,—у Куклінай—Наташы спачатку ўспрымаецца як гульня ў словы і толькі потым, калі «памыты слон» наступіць на яе веру і прыцісне сэрца, Наташа ўпершыню ўсвядоміць, які страшэнны сэнс хаваецца за выпадковым жартам. «Сустракацца не будзем»,—пакідае Наташа запіску, пакідаючы Электрона.

З гэтай сцэны ў гомельскім спектаклі набывае сілу маральны канфлікт, гучанне якога выходзіць далёка за межы інтымных узаемаадносін паміж закаханымі. Ідзе спрэчка ахоўнага скепсісу з высокім пачуццём, ідзе барацьба за сцвярджэнне прыгожых і ўзнёслых слоў там, дзе за імі стаяць сапраўдныя пачуцці—вялікае, чыстае, сапраўднае. І ўсе старонкі ролі ў М. Куклінай запоўнены вядомай і трапяткой абаронай чалавечай высакароднасці. Жаночай інтуіцыяй яна ўгадвае ў Электроне блізкага сабе па духу і светаўспрыманню і змагаецца за тое, каб яе каханы стаў, нарэшце, самім сабою.

Наташа ў М. Куклінай — увасабленне чалавечай шчырасці і натуральнасці ва ўсім. І нават пасля смерці гераіні яе вобраз працягвае ўплываць на ўвасабленне думкі твора: яна нібыта зноў спрачаецца з Вясёлым грамадзянінам, які змяніў не толькі сваю прафесію балалаечніка на ілюзіяніста, а і тэорыю «памытага слана» падмацаваў сентэнцыямі пра ілюзію, — маўляў, тут без партнёра не абыдзешся.

Смерць Наташы ў М. Куклінай—удар па скептыцызму, адказ бязвер'ю, бяскрыласці, ілжывай фразе.

Яшчэ—трагічная перасцярога аб тым, што мы губляем, калі сарамліва, нібыта ад мяшчанскіх слонікаў, адмаўляемся ад шчасця.

Яшчэ...

Прыгадваецца думка:

«Калі справа ідзе аб жыцці ці смерці, выступае штосьці большае за логіку, і гэта большае можа перадаць толькі мастацтва».

Вось гэта «большае за логіку» прысутнічае ў паэтычным вобразе Наташы Аляксандравай, якую мы нядаўна ўбачылі ў гомельскіх «Ста чатырох старонках пра каханне».

А цяпер вернемся да купалаўцаў.

Тут усё інакш.

У першай сцэне (маладзёжнае кафэ) мы ўбачылі звычайную дзяўчыну з «непрыгожым смехам», даволі недалёкую і несур'ёзную.

З такім выходным пунктам ролі можна пагадзіцца, калі мець на ўвазе далейшы духоўны рост Наташы пад уплывам Электрона (гэта была б зусім інакшая, чым у гомельскай пастаноўцы, аднак заканамерная трактоўка п'есы).

А Электрон?

У купалаўскім спектаклі аб духоўным уплыве гэтага героя на Наташу не можа быць ніякае размовы. Артыст А. Мілаванаў рэкамендуе нам Электрона як зацятага спакусніка, як чалавека на дзіва самаўпэўненага, эгаіста.

Узяўшы вобраз па-за кантэкстам твора, таксама можна пагадзіцца, што ў п'есе зноў-такі ёсць падставы для такой выходнай думкі ў характарыстыцы героя, калі мець на ўвазе яго духоўнае перараджэнне пад уплывам Наташы Аляксандравай (яшчэ адзін з магчымых варыянтаў трактоўкі п'есы).

Магчыма, чытача збянтэжаць амаль даслоўныя паўторы, дапушчаныя намі. Аднак мы іх свядома робім, каб падкрэсліць, што п'еса гэтая дае тэатрам найшырэйшую прастору ў выбары шляхоў увасаблення яе галоўнай думкі. Адно абавязкова: каб сцэнічны лёс герояў не застаўся толькі расказанай гісторыяй пра выпадковую сустрэчу. Штосьці павінна ў іх адбыцца важнае, што б іх прымусіла па-новаму зірнуць і на сябе і на людзей, а разам з імі і нас—заклікаць да роздуму аб жыцці.

Аднак Наташа—Г. Талкачова і Электрон—А. Мілаванаў ужо пры першай іх сустрэчы абое не абяцаюць нічога ні адзін аднаму, ні нам. Ён—цынік і нахабнік. Яна—дурнічка. Ён ужывае самыя банальныя прыёмы заляцання. Яна не менш банальна «клюе» на іх.

Дапусцім, што аўтар дае права тэатру пачынаць спектакль і з гэтакай экспазіцыі, бо ў перспектыве ў рэжысёра і артыстаў ёсць магчымасць раскрыць перад гледачом цудадзейнейшую сілу кахання, зведаўшы якое Наташа з Электронам больш не здолеюць заставацца ранейшымі. Правёўшы іх праз роздум і пакуты, праз боль і радасць, тэатр мог бы змястоўна, паэтычна ўславіць пачуццё, якое ўжо ўслаўлялася мільён разоў. Тады б ён апраўдаў назву спектакля—«Яшчэ раз пра каханне».

Ды толькі ў спектаклі, які пастаўлены на сцэне акадэмічнага Тэатра імя Янкі Купалы рэжысёрам-дыпламантам Ленінградскага дзяржаўнага інстытута тэатра, музыкі і кінематаграфіі Б. Ганагам, няма... кахання.

Ёсць эфектнае, прыгожае і моднае афармленне А. Грыгар'янца з трагічным зрокам зорных далячынь (але няма таго, што ў п'есе тоіцца за словамі Наташы «Чухрай на небе»).

Ёсць электроннае гучанне музыкі — затоенай, трывожнай, з акордамі асуджанасці і пакут (але замест гракоў — вароны).

З усіх магчымых інтанацыйных афарбовак слоў, імкненняў і ўчынкаў персанажаў у спектаклі адабраны найбольш нервовыя і рэзкія, пазбаўленыя цеплыні. Ствараецца такое ўражанне, нібыта Наташа і Электрон увесь час помсцяць адно аднаму за штосьці. Так, з «пагрозай помсты» Электрон—А. Мілаванаў заяўляе ў кафэ, што яму «спадабаліся не вершы, а дзяўчынка». Так перасаджваецца ён да Наташы і, зняўшы сумачку з яе стала, перапыняе «гіпнацізёрскім» жэстам яе спробу запярэчыць. З позіркам удава палохае: «Я — песіміст». Банальная шматзначнасць пранізвае яго тырады аб тым, што «ў кожную секунду мы губляем мінуту жыцця». Артыст (трэба аддаць яму належнае) даносіць у гэтай фразе вельмі дакладны і акрэслены падтэкст: яго герой даволі празаічна прапануе сваёй партнёрцы нагнаць упушчанае. І калі ў пачатку трэцяй карціны ён пакажа: «Мой дом, маё акно»,—гэты падтэкст набудзе ўжо ноткі нецярплівасці і раздражнення, а Наташа—Г. Талкачова, спалохаўшыся іх, бязрадасна і сумна пойдзе з Электронам, ведаючы загадзя, на што яна ідзе.

Уся сцэна ў пакоі Электрона да пацалунка—расказ аб тым, «як нехта прывёў кагосьці». Ён—дамагаецца. Яна — марудзіць. Ніякіх паўтонаў, нюансаў, жадання разглядзець, пазнаць адзін аднаго. Усё — вядома. І ў пацвярджэнне зведанасці думак сваёй госці Электрон, наўмысна «аступіўшыся», высмейвае яе жаданне адцягнуць «ракавую» хвіліну, і тая ўздрыгвае: яна—чакае ад яго нападу. Тады ён намякае, што бацькі на поўдні, што ў кватэры няма нікога і няма чаго баяцца. Яна — яшчэ марудзіць. Нарэшце ён са здзекам і іроніяй праводзіць уяўную граніцу, падзяліўшы пакой на дзве «зоны», пасля чаго, насуперак рэмарцы аўтара, замест нейкай палёгкі («Нібыта гэта вырашыла ўсе пытанні»), надыходзіць яшчэ большая прыгнечанасць няёмкасці і бруду. У вачах Электрона—здзек і злосць. Ён нібыта кажа: ты ж ведала, чаго ішла. А Наташа...

Пасля зацямнення яна бярэ свой плашч з падлогі і запраўляе кофтачку ў спадніцу.

Усё.

«Чухрай на небе»?

Змрок.

А далей на працягу ўсяго спектакля мы будзем сведкамі таго, як бортправадніца Наташа Аляксандрава будзе клясці свайго выпадковага партнёра, злосна лупцаваць яго ў грудзі, біцца ў істэрыках, і ўрэшце даведаемся пра яе смерць.

Адмучылася...

А Электрон, не разумеючы яе папроку, галашэнняў, то будзе апраўдвацца, то паспрабуе сам ісці ў наступ з узаемнымі абвінавачваннямі і, нарэшце, у недаўменні задумаецца: што за чалавек была яна, чаго хацела?

І мы задумаемся: можа, Наташа—Г. Талкачова зманіла нам, сказаўшы, што не паспела выйсці з палаючай машыны?..

Страшная і жорсткая, бязлітасная думка.

«Накаркалі» вароны.

Што ні кажы, а ёсць свая логіка і паслядоўнасць у рэжысёра. Ды толькі якая яна бязрадасная, змрочная. Вароны, памыі ў вёдрах, бутэлькі з-пад выпітых напіткаў, «памыты слон» замест не толькі вялікага, сапраўднага і чыстага, а нават замест ілюзіі. Абвінавачанні, папрокі і знявагі. Слёзы і праклёны. Смерць.

Не ведаю, ці знойдуцца прыхільнікі такой «лагічнасці». Скажу адно: яна не мае дачынення да п'есы Э. Радзінскага і да кахання—пачуцця, якое ведае пакуты, сум, расчараванні і якое ў той жа час —найвышэйшая ўрачыстасць нашага жыцця.

Выходзяць на экран

«УСЯГО АДНО ЖЫЦЦЁ»

«Смерць мяне пачакае,—гаварыў ён сябрам і блізкім, — я яшчэ паваюю». І ён доўга і ўпарта змагаўся са сваёй смяротнай хваробай, якая дзень за днём адбірала ў яго жыццё. І не выпадкова Уладзімір Скуйбін, чалавек з трагічным лёсам, ставіў фільмы, героямі якіх былі сумленныя, непадкупныя, мужныя людзі. Рэжысёр зняў чатыры фільмы: «На графскіх руінах», «Жорсткасць», «Цудадзейная», «Суд». Ён памёр у 34 гады, у росквіце творчых сіл, але памяць аб сабе пакінуў яркую.

— Мы імкнуліся зрабіць не столькі біяграфічны кінанарыс, — расказвае рэжысёр фільма В. Лісаковіч, — колькі прымусіць гледача задумацца аб гэтым чалавеку — разумным, маладым і таленавітым, аб яго трагічным лёсе, аб тым, якога ён ікага напружання сіл патрабавала ад яго, смяротна хворага чалавека, надзвычай складаная прафесія кінарэжысёра.

Вытворчасць Цэнтральнай студыі дакументальных фільмаў. Аўтары сцэнарыя—М. Мернель, Э. Максімава, рэжысёр — В. Лісаковіч, аператар — А. Левітан.

«ФАРБЫ ДЗІАНІСІЯ»

За Волагдаю на беразе Барадаеўскага возера стаіць Ферапонтаў манастыр. У адным з яго сабораў захаваліся славутыя фрэскі старажытнарускага мастака Дзіанісія. Ён не быў манахам, як многія іканапісцы ў тыя часы, і свет для яго быў не юдоллю смутку і страху, а царствам прыгажосці і радасці. Яго фрэскі — гэта ўрачысты гімн у фарбах, што прыйшоў да нас з глыбіні стагоддзяў.

Мінула амаль пяць стагоддзяў, але мастацтва вялікага майстра не старэе і сёння. Фрэскі Дзіанісія ў Ферапонтавым манастыры—наша нацыянальная гордасць.

Вытворчасць Маскоўскай кінастудыі навукова-папулярных фільмаў. Аўтар сцэнарыя—В. Зак, рэжысёр — Я. Мірымаў, аператары — П. Утачкін і А. Фядотаў.

ТЕАТР № 7

Ліпеньскі нумар «Театра» адкрываецца артыкулам яго галоўнага рэдактара Ю. Рыбакова «Спрэчкі сезона».

Тэма «спрэчак сезона» знайшла сваё адлюстраванне і ў радзе іншых артыкулаў. «Сучасная проза на сцэне МХАТ» — так называецца артыкул Б. Емяльянава аб новых работах праслаўленага тэатра. Гаворка ідзе пра інсцэніроўкі раманаў, аповесцей і апавяданняў — «Іду на навальніцу» Д. Граніна, «Тры доўгія дні» Г. Беленькага, «Святло далёкай зоркі» А. Чакоўскага, «Я бачу сонца» Г. Думбадзе і «Зіма трывогі нашай» Д. Стэйнбека.

У артыкуле А. Анінста «Відовішча незвычайнае» расказваецца пра спектакль «Дзесяць дзён, якія ўзрушылі свет», пастаўлены Маскоўскім тэатрам драмы і камедыі на Таганцы. Як вядома, спектакль гэты, створаны кіраўніком тэатра Ю. Любімавым па матывах цудоўнай кнігі Д. Рыда, прынёс тэатру заслужаную славу.

Гастролям у Маскве Кіргізскага акадэмічнага тэатра прысвечаны артыкул В. Рыжовай «Госці з Кіргізіі».

У часопісе змешчан артыкул Ю. Зубнова «Сродкамі вясёлага жанру», дзе аналізуюцца творы сучасных савецкіх камедыёграфаў.

У раздзеле «Спектаклі» чытач знойдзе рэцэнзіі на новыя работы маскоўскіх тэатраў: «Праўда і крыўда», «Вішнёвы сад», «Дзядзечкаў сон», «Прыніжаныя і зняважаныя» і «Дух Фландрыі».

Часопіс публікуе падрабязную справаздачу пра абмеркаванне дванаццатага нумара часопіса «Театр» за мінулы год. Яно вылілася ў вялікую размову «аб становішчы маладых акцёраў у сённяшнім тэатры, аб адносінах іх да крытыкі і аб іншых рэчах».

У раздзеле «Партрэты»—нарысы П. Тура пра Леаніда Уцёсава, Ю. Грыгаровіча — пра Фёдара Лапухова і Л. Ахвердзяна — пра Грач'е Нерсесяна. Успамінамі пра Марджанава дзеліцца Тамара Вахвашвілі, а пра Самборскую — Д. Дэйсмар.

Раздзел «Хроніка» ў гэтым нумары цалкам аддадзены рэпартажу «Адэса — горад тэатральны». Шмат радасці прынясе чытачам надрукаванае ў часопісе апавяданне А. Купрына «Кармэн». Гэтае апавяданне друкавалася ў адным мала распаўсюджаным зборніку за 1913 год і з тае пары не перадрукоўвалася.

У раздзеле «Зарубежны тэатр» апублікаваны артыкул М. Аляксеева «Нью-Йорк у перапынках паміж спектаклямі» і мноства карэспандэнцый, якія расказваюць пра тое, што адбываецца на сцэнах свету.

Паэтычная ПАВЕРКА

Мікола КУПРЭЕЎ

АПАНТАНЫ

Падаю на мяккі вільготны мох, пад бярозку.
З расой прыйдзе вечар. Будзе добра
ляжаць на зямлі,
слухаць ля самага вуха шэпат бярозы,
мармытанне крынічкі пад дубам, мураўіныя
воклічы перад сном...
І будзе так усё проста, складана і проста.
І будзе прагалак між соснаў у зорнае
неба акном.

Што ж я сёння шукаў? І што сёння пакінуў
там, за лесам, за вечарам, за палямі —
у шматпавярховым і шумным свеце што
я пакінуў? —
з радасцю? З жалем?

Вырастала над горадам сонца-нядзеля.
З каштанаў раса на асфальт ападала.
У пакоі ўсміхаўся і плакаў-спяваў
Раберціна Ларэці,
а яна прада мною так юна стаяла,
і ў вясёлых яе валасах гладзіў я промні
сонца,
і яна глыбінёю вачэй сваіх светлых вочы
мае цалавала.

Потым мы з ёю выходзілі з дому,
ішлі па Зялёным праспекце
з вялізнай блакітнаю сумкай,
заходзілі ў магазіны,
бралі бульбу, капусту, мяса, цыбулю, перац,
зборнікі вершаў Тувіма і Вінакурава.
Потым яна варыла, я тупаў вакол
і замінаў ёй. Злавалася. Біла мяне ручніком,
І, як заўжды, перасольвала.

Спалохаўся шчасця, уцёк пад смалістыя
сосны...
Ляжу пад сузор'ем Лебедзя, сцішаны, босы.

Чую цяжкое дыханне зямлі,
чую, як па той бок Зямлі
плывуць і гудуць акіянскія караблі.
І я стаю на іх палубах.
Плыву, выбіраю свой бераг,
іду праз пустыні і стэпы.
І падаю тут вось на мяккі вільготны мох.

Звонка падае шышка ў ціш сасняку.
Вострым рогам месяц п'е малако бярозы.
І чую, як дзесьці блізка п'юць ваду
з ручайка
разгарачаны лось з нясмела-прыгожай
лошай,
чую, як шэпчуцца, адыходзячы.
... Бягу. Роснай сцежкай, дарогай, полем.
У горад. Да той, што чакае мяне,
стаіць ля начнога акна,
накінуўшы шалік на плечы дрыготкія.

Зноў уцякаю ад шчасця — у шчасце.
Калі гэта скончыцца?
Хай не канчаецца!
Хай толькі зноў там усё ў яе перасоліцца!

Сцяпан ГАЎРУСЕЎ

СЛАНЕЧНІК

Гуляў сланечнік у шырокім полі,
Прад ім у пояс гнулася трава.
І лета было душным, як ніколі —
Ад дружных пчол гудзела сінява.

Забыўшы пра братоў жоўтагаловых,
Адзін дайсці да поўначы гатоў,
Ён не заўважыў між лясоў яловых,
Як дачакаўся зімніх халадоў.

Дарэмна сонца дзіцянё гукала
Праз скошаныя рыжыя лугі —
Не ўгледзела яго, не прычакала
З-за гаманкой струменістай смугі.

Навек застыў ён на ільдзістай грудзе —
Загадкава-упарты сілуэт —
І думае — ці скора будуць людзі
Хадзіць, не азіраючыся ўслед.

Марк СМАГАРОВІЧ

ГРОМ

Кудзеля хмар плыве здалёку.
Стаю пад дахам, ля каліткі.
Мне не даюць ступіць і кроку
Дажджа нацягнутыя ніткі.

Грукоча гром.
І я ў здзіўленні:
То ж трэба быць такой там сіле!
Нібы шматтонныя камені
Качаюцца па небасхіле.

А ён жа, гром, — з зямное пары
Раджаецца спакойны, кволы.
А ўжо калі збярэцца ў хмары,
Дык страсяне навокал долы.

ІШОЎ СОРАК ПЕРШЫ...

Надрукавана ў «Маладосці»

Аддаючыся часам успамінам пра тое, што было дваццаць з лішнім гадоў назад,—пра «слату і нягоды і начныя паходы», я дзіўлюся, як на экране памяці, побач з тымі, каго надарылася сустрэць на партызанскіх дарогах, з кім даводзілася дзяліць партызанскі сухар, незаўважна вырастаюць постаці сурова-маўклівага Карпа Маеўскага, самазабыўнага гаваруна Саўкі Чмаруцькі, пяшчотнай і спагадлівай «усіхнай» маці Ганны Міхайлаўны Корзун, юнага рамантыка і філосафа Міці Птаха, «жалезнага дзеда» Мікіты Труцікава... Іх многа — каго я не ведаў тады, каго ў сапраўднасці і не было, але хто цяпер, не пытаючыся маёй волі, прыходзіць у маё партызанскае «кіно».

Так, гэта сапраўды ўжо мая памяць — людзі з «Глыбокай плыні» Івана Шамякіна, «Векапомных дзён» Міхася Лынькова, «Партызан» Алеся Адамовіча, «Сасны пры дарозе» Івана Навуменкі, ваеннай дылогіі Аляксея Кулакоўскага і многіх іншых кніг пра наша беларускае Супраціўленне. Цудадзейная сіла мастацкага слова рассунула межы раёна, дзе несла сваю службу наша партызанская брыгада, і здаецца, нібыта я ўласнымі нагамі прайшоў усю ахопленую полымем народнага гневу Беларусь.

А сёлета я набываю яшчэ некалькі знаёмых з «тых гадоў», а на маёй партызанскай карце ўзнікаюць новыя сцежкі, якія, спадзяюся, будуць прыгадвацца падчас такіх патрэбных душы падарожжаў у абпаленае вайной юнацтва. Гэтае знаёмства адбылося на старонках рамана Алеся Асіпенкі «Вогненны азімут».

«Вогненны азімут» — раман аб горкім, роспачным і мужным сорак першым годзе на беларускай зямлі, аб тым, як людзі, раптоўна адарваныя ад Вялікай зямлі вогненнай паласой фронту, ачомваліся і шукалі «азімут» у надзвычайных абставінах фашысцкай акупацыі, як вывяраліся, мацнелі ці рваліся старыя і ўзнікалі новыя сувязі і ўзаемадачыненні, як паступова выспяваў народны гнеў і ўспыхвалі першыя агні партызанскай вайны.[1] Іменна драматызм і своеасаблівая героіка сорак першага года захапілі думку пісьменніка і сталі пафасам рамана. Пра гэты час, як вядома, напісана нямала твораў—праўдзівых і менш праўдзівых, нават зухавата-аптымістычных. Аўтары гэтых апошніх, увогуле не закрываючы вочы на трагізм абставін і рэальныя цяжкасці арганізацыі партызанскай барацьбы, усё ж такі збіваліся на танныя абагульненні. Давяраючыся ім, можна падумаць, што не паспеў прыйсці вораг, як усе людзі, і стары і малы, адразу ж выстраіліся ў партызанскія калоны і рушылі на варожыя гарнізоны і камунікацыі. Ды справа не толькі ў гэтым. Яшчэ горш, бадай, што зухаваты аптымізм перашкаджаў раскрыць і ацаніць усю меру пакут і мужнасці, якімі аплочана наша перамога, з належнай глыбінёй паказаць маральна-псіхалагічныя вытокі народнай героікі. І хочацца лішні раз парадавацца, што лёгкадумныя легенды аб вайне сталі ўжо далёкім учарашнім днём нашай літаратуры, што, у прыватнасці, тэма жыцця і барацьбы народа ва ўмовах фашысцкай акупацыі развіваецца сёння на традыцыях шчырых і праўдзівых твораў.

Асноўная калізія рамана «Вогненны азімут» звязана з дзейнасцю групы актывістаў раёна, пакінутых у тыле ворага для арганізацыі партызанскай і падпольнай барацьбы. І што ж атрымліваецца? Загортваючы апошнюю старонку рамана, чытач можа расчаравана пацінуць плячыма: дзе ж барацьба? дзе ж тая зямля, што гарыць у ворага пад нагамі суцэльным полымем? І сапраўды: кіраўнік групы Галай гіне; яго пераемнік Тышкевіч трапляе ў лапы фашыстаў і, цудам выбраўшыся адтуль, толькі пачынае аднаўляць сувязі і збіраць рассеяныя сілы сяброў; Самарос, паранены, выбывае са строю і таксама трапляе ў лапы ворага; Прусава імкнецца арганізаваць падпольную групу ў горадзе, але гэта не дае вынікаў; Бандарэнка ўсяго што намацвае «гаручы матэрыял» сярод былых рабочых прамкамбіната; Каршукоў па сутнасці паралізаваны, як арганізатар, хітрай гестапаўскай правакацыяй; створаны ў гэтай мясцовасці атрад з акружэнцаў (баталаўцы) пакуль што туляецца па зацішных кутках; нешматлікія ўзброеныя сутычкі з ворагам служаць хутчэй сведчаннем слабасці, а не сілы партызанскіх груп...

Ці не запаволіў тут раманіст разгортванне падзей? Відаць, знойдуцца чытачы, якія будуць папракаць яго ў гэтым, спасылаючыся на параўнаўча шырокі размах партызанскага руху ў тым ці іншым раёне ўжо летам і восенню сорак першага года. Але і ў аўтара рамана ёсць свае аргументы: партызанская барацьба развівалася не ўсюды ў аднолькавым тэмпе, і права пісьменніка — выбіраць сабе «раён дыслакацыі». Гаворка ж ідзе не аб запаўненні наградных лістоў. Але калі ўжо гаварыць аб увасабленні галоўнага грамадскага канфлікту часу, то, чытаючы «Вогненны азімут», мы безумоўна жывём у атмасферы вайны — вайны ідэалагічнай, маральнай, псіхалагічнай, за якой адчуваюцца блізкія і грозныя грымоты партызанскай эпапеі. У гэтым напрамку і працуе сюжэт рамана, усе яго шматлікія адгалінаванні.

Кніга добра пераконвае, што народ ні на мінуту не скарыўся ворагу, што вораг ужо ў першыя дні і месяцы цярпеў непапраўнае паражэнне: тэрытарыяльна захопленая ім зямля духоўна заставалася непрымірымай. Раман «Вогненны азімут» — гэта, як мне вядома, частка больш шырокай мастацкай задумы аб падзеях на беларускай зямлі ў час акупацыі, і пісьменнік будзе яшчэ мець магчымасць паказаць, у што выліўся патрыятызм і гнеў народа. Пакуль жа перад намі сорак першы год. Людзям трэба было перш за ўсё выстаяць маральна, знайсці апору і раўнавагу, пераадолець роспач і разгубленасць, не паддацца фанабэрлівай гітлераўскай прапагандзе, якая трубіла аб апошніх днях Масквы. Вельмі няпроста ўсё гэта было ў жыцці, вельмі нялёгка давалася чалавеку яснасць. «Міхась уважліва прыслухоўваецца да ўсяго, пра што гавораць людзі. Хочацца разабрацца, выдзеліць з несправядлівых абраз і сварак тое галоўнае, чым жывуць цяпер людзі, знайсці сярод розных поглядаў адзіную праўду, якой павінен трымацца чалавек», — гэтыя думкі аднаго з герояў рамана ўспрымаюцца і як ідэйная задача раманіста. Ён смела ідзе насустрач «хаосу» падзей, фактаў, імкненняў, прыглядаецца да самых розных людзей, каб за рэальнай размаітасцю жыцця ўбачыць галоўнае, заканамернае.

Імкнучыся з найбольшай выразнасцю перадаць драматычную праўду сорак першага года, Асіпенка бярэ звычайна самыя цяжкія і бязлітасныя варыянты чалавечага лёсу, якія ўзнікаюць ці то як непазбежны вынік фашысцкага разгулу, ці то з прычыны нявопытнасці і неасцярожнасці некаторых герояў рамана. Думаецца, што раманіст нават траціць меру, прымушаючы сваіх герояў абавязкова праходзіць усе дзевяць кругоў пекла. Калі сітуацыі адпаведнага напалу з'яўляюцца неабходнымі для раскрыцця характару Каршукова, — тут, можна сказаць, прыклад арганічнага адзінства характару і акалічнасцей, — то надзвычайны лёс Тышкевіча, Галая, Самароса, Ядвісі (якія таксама трапляюць у лапы ворага) мала абгрунтаваны мастацка і амаль нічым не ўзбагачае ўнутраны свет персанажаў.

Ці не адыгрывае тут сваю ролю, акрамя ўсяго, і спакуса дабіцца такім іменна шляхам сюжэтнай займальнасці? Але тады скажам аўтару, што больш «займальнымі» выглядаюць, з большай сілай уздзейнічаюць якраз тыя старонкі, на якіх ён спыняе наравісты бег прыгодніцкага сюжэта і засяроджваецца на «прыгодах духу», шукае драматызм у глыбінях псіхалагічнага жыцця, ва ўзаемаадносінах людзей — і блізкіх і розных па ідэйных пераконаннях. І Каршукоў, і Ядвіся, і Міхась Ланкевіч, і Тышкевіч, і Самарос, і Валенда, і Вера Прусава, і Сідаронак, і многія іншыя персанажы прыносяць у раман грамадскі і псіхалагічны змест, цікавы для мяне, чытача, сам па сабе, без прыгодніцкага «гарніру». Вядома, запамінаецца, уразаецца ў памяць гісторыя ўцёкаў Тышкевіча з палону, ад паліцаяў, прычым запамінаецца без ніякіх намаганняў — як любы выключны факт. Але я, чытач, з большай ахвотай хачу запомніць, засвоіць, напрыклад, знешне неэфектны эпізод, калі Бандарэнка сустракаецца з рабочымі прамкамбіната (у хаце Шаіркі), малюнкі будзённага жыцця вясковай моладзі, узаемаадносіны даўніх ворагаў Каршукова і Сідаронка, тое, як глядзіць на свет і падзеі, як гаворыць, якім лексіконам карыстаецца Вера Прусава, старонкі, прысвечаныя баталаўскай групе, сцэны каля лагера ваеннапалонных, калі Ядвіся «выкупляе» камісара Чабаноўскага... У гэтых выпадках пісьменнік, менш заклапочаны «раманізацыяй» жыццёвага матэрыялу, акунаецца ў жывую непасрэднасць факта і яго пяро робіцца шчырым і па-сапраўднаму эмацыянальным.

Як я ўжо гаварыў, Асіпенка разгортвае сюжэт вельмі шырока, уводзіць у дзеянне вялікую колькасць персанажаў. Прынамсі, не менш дзесяці персанажаў можна было б назваць галоўнымі—іх пісьменнік бярэ буйным планам, даючы ім самастойныя дарогі. Гэта звязана з агульнай задумай твора (напомнім — яшчэ не вычарпанай) як шырокай карціны народнага жыцця і барацьбы. Пакуль што, вядома, цяжка скласці канчатковае меркаванне аб тым, як пісьменнік справіцца са складанай кампазіцыйнай задачай і ці здолее ён кожны вобраз, пастаўлены ў цэнтр увагі, зрабіць характарам. Але ж мы маем права разглядаць раман «Вогненны азімут» і як самастойнае цэлае. І вось мне думаецца, што Асіпенка не разлічыў свае сілы, так смела адкрыўшы старонкі рамана насустрач шырокай плыні жыцця. Здолеўшы праўдзіва перадаць характэрныя асаблівасці сорак першага года, яго жывую атмасферу, ён, аднак, мала выяўляе сябе як даследчык глыбокіх прычын і вытокаў падзей і ўчынкаў чалавека. Цікавыя, арыгінальныя характары — Каршукоў, Вера Прусава, Самарос, Сушчэўскі, Міхась Ланкевіч, Ядвіся, Сідаронак, Валенда. Гэта сапраўды — характары, а не толькі персанажы. І ўсё ж псіхалагічная і сацыяльная ёмістасць іх—адносная, больш абазначаная графічна, чымся напоўненая крутым, гарачым зместам эпохі. Чытаючы раман і спяшаючыся ад персанажа да персанажа, так і хочацца сказаць аўтару: ды спыніся ты, дай пабыць з чалавекам, пражыць яго жыццё ў дэталях, заглянуць у яго душу, і сённяшнюю і ўчарашнюю, яна ж столькі сабрала з дарог нашага грамадства!

Туга па большай значнасці, «эпахальнасці», ці што, характараў рамана ўзмацняецца яшчэ і тым, што наперадзе ў іх — вялікая дарога праз вайну. Ці не пагражае Асіпенку характэрны недахоп некаторых «эпапей», аўтары якіх на марафонскую дыстанцыю выпускаюць герояў-спрынтэраў і потым вымушаны падтрымліваць іх энергію ўколамі прыватных сітуацый.

Зрэшты, не буду гаварыць «пад руку», пакладзёмся лепш на ўдумлівасць і інтуіцыю самога пісьменніка, захопленага вялікім і ўдзячным матэрыялам. Будзем спадзявацца, што яго ўжо сталае пяро на наступных старонках пазбавіцца той упэўненасці, якая мяжуе з бойкасцю, і дасягне большых глыбінь грамадскага жыцця і псіхалогіі чалавека. А ўвогуле я хачу закончыць тым, чым пачаў: радасцю новых цікавых знаёмстваў...

Н. ПАШКЕВІЧ.

[1] Алесь Асіпенка. «Вогненны азімут». Раман. Часопіс «Маладосць», 1965. №№ 2—5.

В. Жураўкоў. «Ткачыхі мінскага камвольнага камбіната». (Масла).
(З дыпломных работ выпускнікоў Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута).

НА ЭКРАНАХ ТЭЛЕВІЗАРАЎ

ПАМЯЦЬ АБ ГЕРОЯХ ЖЫВЕ

На Гомельскай студыі тэлебачання пастаўлены спектакль па п'есе Л. Персціна «Пасля камендацкага часу», прысвечаны барацьбе маладых гомельскіх падпольшчыкаў на чале з Іванам Жалезняковым супраць фашысцкіх акупантаў (пастаноўшчык спектакля В. Строкаў).

Аўтар п'есы адлюстраваў адзін з найбольш напружаных эпізодаў гэтай барацьбы — ажыццяўленне смелай дыверсіі падрыву афіцэрскага эшалона.

... На вуліцах Гомеля ні на хвіліну не заціхала барацьба супраць фашыстаў. У доміку Жалезняковых быў адзін са штабаў падполля. Адсюль ішлі на заданне сябры Івана. Адзін з іх трапіў у рукі ворагаў. Сябры не сумняваюцца ў яго мужнасці, але месца дыверсіі вырашаюць змяніць. І — недарма. Праз аднаго са здраднікаў фашысты даведаліся аб плане падпольшчыкаў. Але, дзякуючы мужнасці і вынаходлівасці юнакоў, эшалон узляцеў у паветра...

Аўтару п'есы ўдаецца, не збіваючыся на дэтэктыў, у складаных перыпетыях гэтай барацьбы досыць ярка і дакладна раскрыць характары маладых змагароў.

Івана Жалезнякова ў тэлеспектаклі іграе Сяргей Гінзбург. Ён, як і ўсе выканаўцы, — удзельнік самадзейнасці. Створаны ім у спектаклі вобраз запамінаецца. Вось, напрыклад, сцэна сустрэчы Івана са старым падпольшчыкам. Спачатку юнак асцярожны і нават трошкі суровы. Гэта натуральна, паколькі ў яго хату ўвайшоў незнаёмы. Пачуўшы пароль, ён на момант быццам пераўтвараецца ў гарэзлівага юнака, бязмежна радага сустрэчы з блізкім чалавекам. Калі пачынаецца дзелавая размова, Іван ізноў сур'ёзны, такі, якім можа быць юнак, калі яму даручаюць важную справу...

С. Гінзбург дакладна перадае псіхалагічныя рысы свайго героя ў сур'ёзныя для яго моманты жыцця. Іван Жалезнякоў — сапраўдны баявы камандзір, кемлівы, рашучы і бясстрашны. Усё ў сваім жыцці ён падпарадкаваў інтарэсам барацьбы супраць захопнікаў. Чулы чалавек і надзейны таварыш, патрыёт і барацьбіт — такім імкнецца паказаць яго С. Гінзбург.

Пераканальна выконваюць свае ролі М. Цубатаў (стары падпольшчык), Ю. Шарамет (Косця), З. Паўлава (Зіна), З. Караткевіч (Марылька), Г. Гера (нямецкі афіцэр), Ю. Хает (здраднік Анатоль), Я. Нікіфараў (кухар), В. Пратапопаў (салдат).

Ёсць у гэтым тэлеспектаклі недахопы — расцягнуты паасобныя сцэны, недастаткова буйных планаў, што не дазваляе гледачу засяродзіць увагу на перажываннях персанажаў. Але галоўнае — расказ пра герояў, якіх вораг не здолеў паставіць на калені, атрымаўся хвалюючы.

Рэжысёр В. Строкаў, кінааператары Ул. Васільцоў, П. Ульянаў, тэлевізійныя аператары Б. Мельнікаў, Ул. Сарокін, рэдактары Н. Шоба, В. Калчунава, мастак Б. Чак разам з выканаўцамі роляў стварылі спектакль аптымістычнага ладу.

Іменна ў кірунку стварэння арыгінальных спектакляў чакае работнікаў Гомельскай студыі тэлебачання поспех.

Д. ІСАКАЎ.

ДАЙЦЕ ТУРЫСТАМ ДОБРУЮ ПЕСНЮ

Кожны, хто летам з рукзакам за плячыма падарожнічаў па роднай краіне, ведае, як увечары ля невялікага вогнішча, сярод лясной цішыні хочацца зацягнуць песню. Вось заспяваў адзін чалавек, да яго далучыліся іншыя, і песня высока ўзлятае ў неба. Людзі спяваюць і думаюць аб прыгажосці роднай зямлі, аб дружбе, народжанай у турысцкіх паходах, аб шчасці першаадкрывальнікаў...

Але ж як мала ў нас яшчэ такіх песенных твораў, словы і музыка якіх раскрывалі б рамантыку падарожжаў, прыгажосць турызму, цяжкасці паходу і радасць адпачынку.

Вось чаму Цэнтральны савет па турызму сумесна з Саюзам кампазітараў і Саюзам пісьменнікаў СССР вырашылі з 15 чэрвеня па 5 кастрычніка бягучага года правесці конкурс на лепшую турысцкую песню. У гэтым конкурсе могуць прыняць удзел і прафесіянальныя, і самадзейныя аўтары.

Першы тур конкурсу праводзіцца ў саюзных рэспубліках да 15 верасня, а другі і трэці — з 20 верасня па 5 кастрычніка ў Маскве. Усесаюзнае журы, якое ўзначальвае заслужаны дзеяч мастацтваў РСФСР кампазітар А. Астроўскі, будзе разглядаць песні, якія атрымалі вышэйшыя ацэнкі на рэспубліканскіх конкурсах.

За лепшыя песні прызначаны дзесяць прэмій: адна першая — 500 рублёў, дзве другія— па 300 рублёў, дзве трэція — па 200 рублёў і пяць заахвочвальных — па 100. Лепшыя песні будуць выдадзены асобным зборнікам.

Наша беларускае журы пад старшынствам заслужанага дзеяча мастацтваў БССР Д. Лукаса ўключае ў сябе паэтаў, работнікаў музычнай культуры, прадстаўнікоў друку і турысцкай грамадскасці.

Чым больш аўтараў зможам мы прыцягнуць да ўдзелу ў музычным конкурсе, тым больш шанцаў на тое, што сярод песень, якія прагучаць у Маскве, будуць і нашы, беларускія. А потым гэтыя песні пойдуць у паход разам з турыстамі, і іх пачуюць людзі ў самых далёкіх мясцінах нашай Радзімы.

Ю. КОКАРАЎ,
намеснік старшыні Беларускага рэспубліканскага савета па турызму.

МАЛОМУ ПРЫНЕСЛІ НОВУЮ КНІЖКУ...

[Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.].

мы, правільна прадбачачы кірунак іх развіцця. Паколькі ж у дзіцячай кніжцы заўсёды два аўтары — пісьменнік і мастак, то такія патрабаванні павінны прад'яўляцца і да мастака. Нельга дапускаць на старонкі кніжак для самых маленькіх пошласць, праявы абывацельшчыны, мяшчанства.

Асобнай кніжкай (жанр — кніжка-малюнак) для самых малодшых выдадзены нядаўна верш А. Дзяржынскага «Яе завуць Каця». Вокладка, на якой намаляваны плакатна-стандартны дзіцячы твар з соскай у роце, пазбаўлена зусім якога-небудзь вобразнага рашэння, гэта хутчэй няўдалая рэклама арцелі, што выпускае соскі і сліняўчыкі, а не вокладка мастацкай кніжкі. Няўдала выбраны для такога выдання і верш, вельмі слабы, бяскрылы. У ім няма сапраўднай мастацкай выдумкі, жывінкі. Справа не толькі ў тым, што А. Дзяржынскі «заездзіў», мякка кажучы, рыфму «Каця — хаце — маці», якую да яго выкарыстоўвалі ў сваіх вершах многія іншыя дзіцячыя паэты (глядзі вершы Э. Агняцвет «Што такое прыгажосць», Ст. Кацубы «Мамы няма дома», Н. Галіноўскай «Не злавіў»). Значна горш тое, што паэт і мастак акцэнтуюць увагу маленькага чытача на нечым зусім несучасным, неістотным.

Нарадзілася маленькая Каця, яе прынеслі дамоў. (Між іншым, я прадбачу тысячу пытанняў да тых бацькоў, якія будуць чытаць дзецям гэту кніжку: а адкуль прынеслі. Цікава, як яны выкруцяцца). І адразу ж:

Вось суседзі і суседкі
Да яе прыйшлі ў адведкі:
І, як бачыце вы самі,
Не з пустымі ўсе рукамі.

Вось, аказваецца, да чаго ўсё звялося! Нельга прыходзіць з пустымі рукамі ў адведкі. Тут мастак, як кажуць, даў волю фантазіі. На адным развароце мы бачым дзевяць чалавечых фігур, масу розных рэчаў хатняга ўжытку, і ўсё гэта намалявана гэтак жа абыякава, рэкламна-халодна, як і вокладка. Вельмі няўдала і скампанаваны гэты разварот: злева зусім незразумелыя тры паверхі.

А далей у паэта пайшлі нават лагічныя недакладнасці, недапушчальныя ў кніжках для самых маленькіх:

Каб жыла ў красе (?) малая,
Бабка ложак аздабляе. (!)
Каб парадаваць малую,
Дзед-мастак дыван малюе. (?)

І малюнкі: і бабка, і дзед, узброіўшыся пэндзалямі і палітрай, размалёўваюць ложак і дыван.

Нельга пісаць для самых маленькіх з меншым натхненнем, з меншай адказнасцю, з меншай творчай аддачай, чым для дарослага чытача.

МАЛОЕ АМАЛЬ што незаўважна для бацькоўскіх вачэй раптам ператвараецца ў падлетка, і яму ўжо зусім не цікава чытаць кніжкі з паметкай «для малодшага ўзросту». Але ў яго засталася абвостраная прага да чытання, да адкрыцця новых даляглядаў невядомага дагэтуль свету. Толькі гэтая прага цяпер больш ёмістая, больш глыбокая, больш усвядомленая, істотная, у некаторай ступені яна і больш канкрэтная, бо ў гэтым узросце ўжо закладваюцца асновы індывідуальнасці, асновы індывідуальна-канкрэтных схільнасцей, густаў, патрабаванняў. І першае патрабаванне ўсіх чытачоў-падлеткаў да мастацкай кнігі — каб яна была цікавая, пра што і як бы ў ёй ні пісалася.

У сучасным жыцці чытача-падлетка вельмі лёгка адарваць ад кнігі, і гэта даволі паспяхова робяць тэлебачанне, спартыўныя секцыі, розныя пазашкольна-масавыя мерапрыемствы ды і проста «вуліца» (ёсць яшчэ такі тэрмін у педагогаў-выхавацеляў). Таму вялікае значэнне мае для пісьменніка арганізацыя сюжэта, кампазіцыя твора, актыўнасць герояў — каб кніжка з першай жа старонкі была цікавай, каб яна адразу захапіла ўвагу чытача-падлетка.

Яшчэ вельмі мала ў нас цікавых ва ўсіх адносінах аповесцей (найбольш папулярнага жанру) для падлеткаў. Вось, напрыклад, апошняя навінка — «Хатабыч-малодшы» Міколы Ваданосава. З першых жа старонак звяртаеш увагу на сюжэтную непрадуманасць, неарганізаванасць, абыякавасць аўтара да формы свайго твора. З героямі аповесці — падлеткамі Міколкам, Алесем і Міхасём адбываецца ў творы вельмі многае. Аўтар расказвае і пра іх няўдалы паход вакол возера, і пра тое, як Алесь дрэсіраваў ката, і пра розныя хітрыкі Міхася з мэтай абдурыць настаўнікаў, не вучыць урокі і атрымліваць добрыя адзнакі, і пра работу хлопцаў у калгасным садзе, і пра іх заняткі ў драмгуртку, і пра катанне на лыжах, і пра тое, як яны рабілі самалёт-ракету, як хадзілі ў лес па ёлку, і пра іншыя здарэнні. Але ўвесь гэты багаты матэрыял не арганізаваны належным чынам, аповесць адразу не зацікаўлівае, у ёй вельмі многа пустых размоў, выпадковых, неістотных здарэнняў. Невялікая па памеру, яна здаецца расцягнутай. Аўтар не здолеў знайсці сапраўды незвычайнае ў звычайным, бо ў яго поле зроку трапляла нешта даволі выпадковае, неістотнае. І самае галоўнае: сюжэт у аповесці «Хатабыч-малодшы» не сцэментаваны паказам росту і станаўлення характару і светапогляду аднаго з герояў (а гэта можна было б зрабіць на прыкладзе «адмоўнага» Міхася). Міколка, Алесь і Міхась вельмі статычныя, мы бачым і адчуваем іх вонкава, аўтар не раскрывае глыбока іх унутраныя перажыванні.

ЗНАЙСЦІ сапраўды рамантычнае ў звычайным жыцці не так і проста, як гэта здаецца на першы погляд. У апошнія гады выйшла многа аповесцей, якія былі пабудаваны па адной схеме: школьнікі выпраўляюцца ў паход па гераічных мясцінах роднага краю, яны знаходзяць якія-небудзь сляды былых партызанскіх баёў, даведваюцца пра подзвігі іх бацькоў і старэйшых братоў, і, урэшце, адмоўныя персанажы перавыхоўваюцца, а станоўчыя вырашаюць яшчэ лепш вучыцца. Ні адна з такіх аповесцей не засталася ў сэрцах чытачоў надоўга, таму што самі персанажы гэтых твораў былі нецікавыя, бяскроўныя, аднастайныя, станоўчыя — завельмі «правільныя», а адмоўныя — з традыцыйнымі аднымі і тымі ж недахопамі.

Аўтары многіх аповесцей і апавяданняў для падлеткаў, паказваючы працэсы перавыхавання герояў, акцэнтуюць увагу пераважна на знешніх фактарах у выхаванні. Часам паказваецца і падкрэсліваецца неабходнасць выхавання грамадскага (удзел школы, піянерскай і камсамольскай арганізацый) і сямейнага (бацькі), пры гэтым зусім забываецца самавыхаванне падлетка і вялікая роля менавіта такога «самавыхавання», гэтай унутранай «дысцыпліны пераадолення і барацьбы», як гаварыў А. С. Макаранка. Мы бачым героя ў мастацкім творы часта ў яго знешніх узаемаадносінах з сябрамі, са старэйшымі, інакш кажучы, яго знешні свет. А хацелася б убачыць і адчуць яго ўнутраны свет, які ў падлеткавым узросце вельмі спецыфічны, своеасаблівы.

У падлетка даволі складаныя ўзаемаадносіны з асяроддзем і асэнсаванне іх, ён па-свойму ацэньвае ўсе з'явы, прычым гэтыя ацэнкі вельмі часта разыходзяцца з думкамі дарослых, нават правільнымі думкамі. Вось, напрыклад, персанажы дзвюх апошніх аповесцей маладога пісьменніка Э. Карпачова «Плывуць над Дняпром воблакі» і «Паляўнічы стрэл», што ўвайшлі ў яго кніжку «Вежа камандора». У першай героі — Жэня і яе брат Герка, дзеці капітана Гранатава — выпраўляюцца з бацькоўскай хаты ў падарожжа ўздоўж берагоў Дняпра. З імі адбываюцца розныя здарэнні — і звычайныя і незвычайныя. У адны верыш (Герка бегаў аж за пяць кіламетраў у майстэрню па патрэбную дэталь, каб шафёр мог выратаваць вельмі хворага чалавека), у другія — не (дзеці сустрэліся ў лесе з оперным спеваком, які жыў адзін у палатцы і хадзіў на бераг Дняпра спяваць арыі). Але асноўны недахоп аповесці не ў гэтым. Героі разам з аўтарам у творы вельмі многа гавораць пра рамантыку, нават называюць сябе рамантыкамі, а сапраўднай рамантыкі так і няма ў аповесці, таму што чытач бачыць толькі знешні, паказны бок таго, што адбываецца з Жэняй і Геркам. Амаль пасля кожнага свайго кроку самі героі выносяць рэзанёрска-дыдактычныя ацэнкі сваім учынкам, прычым ацэнкі з пункту гледжання дарослых, і гэта абяскроўлівае іх, робіць іх «правільнымі» і ў той жа час сумнымі. А вось у другой аповесці Э. Карпачова «Паляўнічы стрэл» — вельмі ўдалы і запамінальны вобраз падлетка Арцёма, таму што пісьменнік асноўную ўвагу звяртае на раскрыццё яго ўнутранага свету, яго характару, на паказ яго асэнсавання сваіх сувязей з асяроддзем. Арцём глыбока перакананы ў сваім намеры перашкодзіць егеру Даніле Данілавічу забіць лося, хоць той і атрымаў на гэта дзяржаўную ліцэнзію. У спрэчцы хлопчыка з дарослым перамагае хлопчык, таму што ў яго ёсць свой погляд на падзеі, свае меркаванні, якія разыходзяцца з меркаваннямі дарослых. Арцёмка — станоўчы герой, і ў той жа час ён зусім не падобны на сваіх пабрацімаў і аднагодкаў з многіх кніжак. Яго, безумоўна, палюбяць юныя чытачы, і не толькі таму, што ён не згадзіўся з дарослым, бо аўтарскія акцэнты пастаўлены даволі дакладна і праўда жыцця, урэшце, на баку хлопчыка.

У АПОШНІ час у нашай дзіцячай мастацкай літаратуры асаблівае значэнне набывае праблема станоўчага героя, праблема ідэалу. Можна скептычна ставіцца да разумення гэтай праблемы з боку тых, хто ад кожнага мастацкага твора «дарослай» літаратуры патрабуе: «дайце нам героя для пераймання». Але для дзіцячай літаратуры гэтая праблема існавала і існуе, бо нам зусім не абыякава, за кім пойдзе малады чытач, хто будзе яго «кумірам», хто завалодае яго думкамі і марамі. І тут вельмі важна стварыць такога героя, каб ён палюбіўся чытачу, не адштурхнуў яго сваёй празмернай «правільнасцю», «гладкасцю», дыдактычнасцю.

Адной з самых неабходных умоў для існавання такога ідэалу з'яўляецца, па-першае, яго выключная сучаснасць, якая павінна праяўляцца перш за ўсё ў яго інтэлектуальным багацці, у яго некаторай інтэлектуальнай перавазе над агульнай масай сярэдняга чытача. Сучасныя хлопчыкі і дзяўчынкі вельмі чулыя да ўсяго новага, самага новага і перадавога, яны таксама значна хутчэй, чым іх папярэднікі, нават 10—20 гадоў назад, асвойваюць усё гэта новае. Па ёмістасці і ўзроўню навукова-тэхнічных ведаў гэтыя падлеткі часам пераганялі нават сваіх бацькоў, і трэба гэтаму толькі радавацца. Падлеткі адразу асвойваюць і прымаюць як сваё, неабходнае, усё новае не толькі ў навуцы і тэхніцы, але і ў мастацтве, у звычайным быце (інтэр'ер кватэры, рэчы хатняга ўжытку), у спорце. Тэлебачанне, радыё і кіно значна павялічваюць памеры карыснай інфармацыі, на асваенне якой не патрэбны вялікія намаганні.

У сувязі са сказаным варта падкрэсліць неабходнасць канкрэтна-гістарычнага падыходу да некаторых вядомых твораў нашай дзіцячай мастацкай літаратуры. «Палескія рабінзоны» Янкі Маўра зрабілі свой станоўчы ўплыў на выхаванне пэўнага пакалення маладых чытачоў. Твор гэты карысны і сёння сваім эмацыянальным запалам, ён абуджае высакародныя гуманістычныя пачуцці, сцвярджае прыгожае. Аднак сённяшнім хлопчыкам і дзяўчынкам усё ж такі надакучыла быць толькі каля Мірона і Віктара, бо яны сёння ўжо значна багацейшыя інтэлектуальна за маўраўскіх герояў. Рамантыка старой Камароўкі змянілася ўжо рамантыкай стварэння адной з лепшых у Еўропе электронна-вылічальнай машыны «Мінск-22», рамантыка прыгод у лясах і балотах — рамантыкай асваення космасу.

Другая неабходная ўмова для існавання героя-ідэалу для падлеткаў — гэта сучасны погляд на месца чалавека ў жыцці, на сапраўдную ацэнку вартасцей чалавека па яго справах, а не па фармальнай пасадзе, якую ён займае ў грамадстве. Бо і да гэтага нашы дзеці вельмі чулыя. Пісьменнік павінен паклапаціцца аб сапраўдным, а не ўяўным аўтарытэце бацькоў, настаўнікаў, піянерскіх актывістаў, калі ён выводзіць іх вобразы ў мастацкім творы. Сённяшняе пакаленне дзяцей фарміруецца пасля гістарычных з'ездаў Камуністычнай партыі, і яно павінна быць зусім пазбаўлена псіхалагічных перажыткаў ранейшага перыяду.

НАШЫ ДЗЕЦІ чакаюць ад мастацкай кніжкі многага, вельмі многага. Невядомы дзівосны свет, які адкрывае маладому чытачу пісьменнік, сёння надзвычай багаты, цікавы, неабдымны ў сваіх геаметрычных памерах. Мастацкая літаратура павінна сапраўды вучыць нашых дзяцей жыць, ствараць, змагацца за самыя лепшыя ідэалы чалавецтва, вучыць, «рабіць жыццё з каго», даваць адказ на вельмі істотнае і вельмі адказнае пытанне — «што рабіць».

ГОСЦІ РЭСПУБЛІКІ

Для нашых дзяцей ужо стала прывычным праводзіць лета ў піянерскіх лагерах. А для Андрыя Шпіноні, Марселя і Монікі Лефеўр і іх таварышаў пад'ём пад гукі горна, піянерскія лінейкі, турысцкія паходы і ўсё жыццё ў вясёлым і шумным акружэнні раўеснікаў — новае, але захапляльна цікавае.

Больш 30 сыноў, дочак і пляменнікаў ветэранаў авіяпалка «Нармандыя — Нёман» і дзяцей нашых суайчыннікаў, закінутых вайною ў Аўстрыю, Заходнюю Германію, Францыю, Італію, прыехалі правесці летнія канікулы ў нас у рэспубліцы. Яны прыбылі сюды па запрашэнню Беларускага таварыства дружбы і культурных сувязей з зарубежнымі краінамі і Беларускага таварыства па культурных сувязях з суайчыннікамі за рубяжом.

Цёпла сустрэлі пляменніка вядомага французскага лётчыка Героя Савецкага Саюза Марселя Лефеўра, сына і дачку кавалера ордэна Аляксандра Неўскага Леона Кюфо і іншых гасцей з-за рубяжу ў лагеры «40 год піянерыі», які знаходзіцца ў Крыжоўцы пад Мінскам.

Дзеці з-за рубяжу наведалі Брэсцкую крэпасць, пабывалі ў Музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, дзе пачулі хвалюючую аповесць пра гераічную барацьбу савецкага народа з фашысцкімі захопнікамі, пра тое, як свята шануюць савецкія людзі памяць аб лётчыках авіяпалка «Нармандыя—Нёман».

На здымку — французскія дзеці ў Музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.

Фота Ул. ЛУПЕЙКІ. (БЕЛТА).

НОВЫЯ ТВОРЫ БЕЛАРУСКАЙ МУЗЫКІ

ПРЭМ'ЕРА ЦЫМБАЛЬНАГА КАНЦЭРТА

Калі чакаеш першага выканання новага твора, заўсёды хвалюешся: што прынясе знаёмства з ім — радасць сустрэчы з цікавай навінкай ці горыч расчаравання? З такім пачуццём уключыў я днямі тэлевізар у час чарговай перадачы «Новыя творы беларускіх кампазітараў». Перадавалі Канцэрт для цымбалаў і сімфанічнага аркестра маладога кампазітара Алега Янчанкі. Немагчыма даць з аднаго праслухоўвання ўсебаковую ацэнку новаму буйнаму твору, але хочацца падзяліцца першымі ўражаннямі.

Кожны твор для цымбалаў мае для нас вялікую цікавасць. Бо цымбалы — любімейшы беларускі народны інструмент — былі раней прыналежнасцю толькі народнага музыцыравання. Цяпер цымбалы, захаваўшы сваё бытавое значэнне, сталі таксама інструментам канцэртным. У гэтым пашырэнні магчымасцей цымбалаў вялікая роля належыць кампазітарам, якія ствараюць для цымбалаў творы самых розных жанраў— ад віртуозных мініяцюр да канцэртаў з аркестрам. Але арыгінальны цымбальны рэпертуар усё яшчэ бедны. З тым большай цікавасцю сустракаеш кожную навінку.

Цымбальны канцэрт А. Янчанкі складаецца з адной часткі, але даволі буйны, развіты твор, які мае некалькі кантрасных эпізодаў. У ім пераважае светлы настрой. Музычныя вобразы — часам скерцозна-рухавыя і задорныя (пачатковы эпізод), часам лірычныя, напоўненыя тонкай паэзіяй (павольны эпізод — адзін з самых лепшых і арыгінальных у канцэрце), або патэтычна-прыўзнятыя (фінальны эпізод). Форма твора дастаткова стройная; адчуваецца стылістычнае адзінства ўсіх эпізодаў. Бадай, толькі фінальны эпізод трошкі кароткі: хацелася б, каб завяршаючая патэтычная тэма была развіта больш шырока і зацверджана больш грунтоўна.

Арыгінальны музычны тэматызм цымбальнага канцэрта. Існуе творчы прыём, які ўжо апраўдаў сябе, калі музычныя тэмы твораў, напісаных для народных інструментаў, павінны мець непасрэдную сувязь з фальклорам. У большасці нашых рэпертуарных цымбальных твораў музычная мова і ўвесь іх вобразны лад непасрэдна абапіраюцца на традыцыі беларускай народнай музыкі. Янчанка адыходзіць ад гэтай традыцыі, ад шмат разоў выкарыстанага творчага прыёму. Тэмы цымбальнага канцэрта маладога кампазітара не выяўляюць непасрэднай сувязі з фальклорам. І я не бачу ў гэтым недахопу. Наадварот, мне здаецца, што Янчанка пашырае магчымасці цымбалаў. Музычная мова новага твора зусім сучасная і звязана з некаторымі характэрнымі тэндэнцыямі савецкай музыкі на яе сённяшнім этапе.

Палажэнне, што фальклорныя тэмы вельмі патрэбныя пры выкананні на народных інструментах, што вобразны лад, непасрэдна звязаны з народнай музыкай, паранейшаму застаецца асноўным для падобных твораў. Але і іншае кола музычных вобразаў тут таксама магчыма і да месца.

Добра выкарыстаны кампазітарам тэхнічныя і маляўнічыя магчымасці цымбалаў. Тут Янчанка таксама шукае і знаходзіць шмат новага, арыгінальнага, пры гэтым спецыфічна цымбальнага.

Вельмі развіта сімфанічная партытура канцэрта. Аркестравыя эпізоды, нярэдка значныя па маштабах, іграюць у сімфанічнай драматургіі твора вялікую і самастойную ролю. Часам ствараецца ўражанне, што гэта не столькі канцэрт для цымбалаў з аркестрам, колькі сімфанічная п'еса з саліруючымі цымбаламі. Гэта здарылася, напэўна, таму, што на прэм'еры аркестр адсутнічаў: яго партыя выконвалася на фартэпіяна. Магчыма, пры поўным аркестравым выкананні, калі пявіцца багацце і разнастайнасць фарбаў сімфанічнага аркестра (а фартэпіянная партыя гаворыць пра яе багатыя сімфанічныя магчымасці), уражанне будзе іншае. Знікне адчуванне аркестравых даўжынь і лішніх паўз у саліста. Можна выказаць пажаданне, каб кампазітар даў самастойны варыянт канцэрта для цымбалаў і фартэпіяна, дзе б некаторыя сённяшнія аркестравыя эпізоды сталі прыналежнасцю партыі цымбалаў.

Лёс новага твора часта знаходзіцца ў руках яго першага выканаўцы. Думаецца, што канцэрт А. Янчанкі знайшоў добрага інтэрпрэтатара ў асобе А. Астрамецкага, які выконваў цымбальную навінку музычна, артыстычна, тэхнічна ўпэўнена. Астрамецкі не пабаяўся несумненных цяжкасцей канцэрта, незвычайнасці яго музычнай мовы: ён зрабіў усё, каб прадставіць новы твор у самым спрыяльным святле. Дадаю, што сам кампазітар выдатна выканаў фартэпіянную партыю. Гэта быў вельмі добры ансамбль.

Трэба пажадаць, каб і сімфанічная прэм'ера цымбальнага канцэрта Алега Янчанкі не прымусіла сябе доўга чакаць.

Л. АЎЭРБАХ.

СТУДЭНЦКІ АРКЕСТР

Гэты камерны аркестр створаны студэнтамі Магнітагорскага горнаметалургічнага інстытута. Арганізатарам і кіраўніком яго з'яўляецца малады аспірант Генадзь Гун. Ён вялікі аматар музыкі. У час вучобы ў інстытуце Генадзь аднач асова здолеў скончыць Магнітагорскае музычнае вучылішча імя Глінкі.

Студэнцкія канцэрты карыстаюцца ў цэнтры уральскай металургіі вялікім поспехам. У праграме — творы кампазітараў-класікаў, савецкіх і зарубежных кампазітараў. Аркестранты горнаметалургічнага інстытута пабывалі ў гасцях у студэнтаў Чэлябінска.

У летнія канікулы будучыя інжынеры накіроўваюцца на гастролі па сельскіх раёнах паўднёвага Урала. Камерным канцэртам будуць папярэднічаць лекцыі аб музыцы.

АДН.

З ГІСТОРЫІ КІНО

Работнікі бібліятэкі Палаца культуры завода «Гомсельмаш» аформілі ў фае кіназала палаца вялікую выстаўку літаратуры па кінамастацтву. Шырока прадстаўлены працы савецкіх кіназнаўцаў па гісторыі айчыннага кіно, кінасцэнарыі лепшых фільмаў, літаратура па замежным кіно, кнігі з серый «Майстры савецкага кіно», «Майстры замежнага кіно».

В. СЯМЕНАЎ.

СКАРБЫ СВІНЦОВАЙ ВЕЖЫ

Свінцовая — адна з чатырох вежаў сярэдневяковага Рыжскага замка, які стаіць на самым беразе старажытнай Даўгавы.

Пасля заканчэння Вялікай Айчыннай вайны старажытнейшая частка замка — у тым ліку і Свінцовая вежа — перададзена ў распараджэнне двух музеяў, якія клапоцяцца аб захаванні і рэстаўрацыі унікальнага архітэктурнага і гістарычнага помніка. А ў новай палавіне замка, якая падверглася многім перабудовам на працягу некалькіх стагоддзяў, размешчаны цяпер Рыжскі Палац піянераў.

Да апошняга часу толькі на двух паверхах Свінцовай вежы размяшчаліся некаторыя экспанаты Дзяржаўнага гістарычнага музея. А ў маі гэтага года наведвальнікі музея атрымалі магчымасць узняцца на апошні паверх вежы. Тут цяпер сабрана і адкрыта для агляду рэдкая калекцыя драўляных скульптур, выкананых невядомымі латышскімі майстрамі.

Яны не выпадкова сабраны вучонымі і гісторыкамі іменна тут, у Свінцовай вежы замка. Самыя старыя з гэтых скульптур, такія, як Мадона з Хрыстом, — аднагодкі вежы, яны таксама «нараджаны» ў XIV стагоддзі. Мастацтва драўляных скульптур у Латвіі пачынаецца з глыбокай старажытнасці. Яшчэ летапісец Пауль Ейнхорн адзначаў: «Латышскія сяляне, апроч земляробства, дасканала валодаюць рамёствамі. Асабліва моцныя яны ў вырабе драўляных прадметаў, у тым ліку драўляной скульптуры. Гэта нават здзіўляе немцаў, якія навучыліся падобнаму рамяству, вандруючы па чужых землях. А латышы развілі гэта мастацтва самабытна і пераўзышлі ў ім немцаў».

Паступовa каталіцкая царква становіцца асноўным заказчыкам мастацкіх драўляных скульптур. Дэкаратыўныя ансамблі цэркваў, усё больш пышныя ўпрыгожанні храмаў памагалі актыўней уплываць на пачуцці веруючых. Аднак народныя ўмельцы, стваральнікі сабраных на выстаўцы шэдэўраў, нярэдка ўкладвалі ў свае работы зусім не духоўны змест. Спачатку можа здацца, што нявялікае разное адлюстраванне гнома з піўным кубкам, якое адкрывае экспазіцыю, неяк выпадае з усёй гэтай багатай галерэі мадон, святых, апосталаў і анёлаў.

Але чым больш уважліва вы ўзіраецеся ў твары ўсіх гэтых фігур, іх позы — жывыя і непасрэдныя ў выказваннях сваіх пачуццяў, тым больш вы разумееце: ніякія яны не святыя і анёлы. Гэта — простыя людзі, сяляне, гандляры, рамеснікі, з іх страсцямі, бедамі, спадзяваннямі і хітрасцю. Такія Маісей XVII стагоддзя, які нагадвае мудрага селяніна, і пяць апосталаў, якія складаюць надзвычай жывую групу асоб — то хітрых, то заклапочаных, то тых, што радуюцца жыццю.

У гэтай калекцыі, сабранай у Свінцовай вежы, ёсць таксама работы адзінай вядомай майстэрні скульптараў па дрэву ў сярэдневяковай Латвіі — майстэрні Сефрэнса-малодшага —1662—1710 гг. Разбяры гэтай майстэрні працавалі ў прыморскім горадзе Вентспілс і апроч царкоўных скульптур рэзалі фігуры для ўпрыгожання насавых частак драўляных караблёў.

Некалькі слоў пра тое, як была сабрана калекцыя.

У XIX стагоддзі драўляныя скульптуры, як «малакаштоўныя», выкінулі з многіх цэркваў Латгаліі, Курземе і Земгале (тры асноўныя раёны сучаснай Латвіі) і замянілі стандартнымі, адлітымі з гіпсу адлюстраваннямі святых. Шэдэўры народнага мастацтва трапілі ў агульны хлам на гарышчы і ў падвалы цэркваў.

У трыццатыя гады нашага стагоддзя Барыс Выппер—гісторык і мастацтвазнаўца, выпадкова наткнуўся ў адным з падвалаў на групу драўляных скульптур. Гэта і паклала пачатак збіранню калекцыі. Выппер шукаў упарта і нястомна. Да пачатку апошняй вайны драўляныя скульптуры былі сабраны ім у Рундальскім замку (Рундале — невялікі гарадок на паўднёвым захадзе Латвіі). Фашысцкія акупанты разрабавалі частку каштоўнай калекцыі.

І вось цяпер скарбы перанесены на верх Свінцовай вежы Рыжскага замка, доступ да іх адкрыты ўсім, хто любіць старажытнае мастацтва разьбы па дрэву.

Аляксандр БАКАЛАЎ. (АДН).

МУЗЫКА І ФАРБЫ

У кватэры вядомага ерэванскага піяніста Якава Заргарана ўсе сцены заняты творамі жывапісу і графікі. Ён вялікі цаніцель і знаўца сучаснага мастацтва, асабліва творчасці армянскіх мастакоў.

У экспазіцыі дамашняй карціннай галерэі работы таленавітых майстроў Мінаса Авецісяна, Геварка Грыгарана, Левана Каджаяна, Аванеса Мінасяна, Уруіра Галсцяна, Марціна Петрасяна. Нельга без захаплення глядзець на дзве цудоўныя жанравыя карціны прадстаўніка старэйшага пакалення Іосіфа Каралава, прысвечаныя жыццю старога Тбілісі.

Сапраўдным упрыгожаннем збору ўсе аднадушна лічаць жаночы партрэт—ранюю рэч буйнейшага сучаснага армянскага скульптара, жывапісца і графіка Ерванда Кочара.

І ўсё ж найбольшую цікавасць у калекцыі Заргарана маюць унікальныя мініяцюры армянскіх мастакоў на дрэве. Цяпер у Заргарана каля 50 такіх мініяцюр.

Першая мініяцюра была створана народным мастачом СССР Марціросам Сар'янам.

— Што мне зрабіць з гэтым кавалкам дрэва?—спытаў мастак Заргарана.

— Ажывіць, варпет (майстар), — адказаў той.— Адлюстраваць на ім тое, што вы лічыце самым важным і галоўным у жыцці чалавека.

— Я адлюструю Радзіму.

Сар'ян напісаў Арменію: над патанаючым у зеляніне сялом, над пірамідальнымі таполямі, над гарамі палымнее світанне.

Значную мастацкую каштоўнасць уяўляюць мініяцюры мастакоў Мінаса Авецісяна, Хачатура Есаяна, Аляксандра Бажбеук-Мелікяна, Вардзідзера Карапецяна, Марыам Асламазян, Рубена Адаляна.

У доме Якава Заргарана гучыць музыка і гучаць фарбы. Піяніст марыць аб тым, каб у яго калекцыі мініяцюр былі работы ўсіх мастакоў Арменіі, а таксама хоць бы па некалькі твораў жывапісцаў братніх рэспублік.

Эдуард МЕЛІК-НУБАРАЎ,
карэспандэнт АДН.

АБМЕННЫЯ КАНЦЭРТЫ

Мінская студыя тэлебачання праводзіць абменныя музычныя перадачы з тэлевізійнымі студыямі братніх рэспублік. На блакітным экране сталіцы выступаюць сімфанічныя аркестры, харавыя калектывы, танцавальныя ансамблі Літвы, Эстоніі, Малдавіі, Расійскай Федэрацыі. Толькі за апошні час атрыманы канцэрты ў запісе на плёнцы «З Саратава мы», «Літоўскі цырк», «Дняпроўскія зоркі» (Кіеў), «Веснавыя галасы» (Пермская студыя) і іншыя. З цікавасцю прагледзелі тэлегледачы цыкл перадач аб музычных тэатрах Ленінграда, Новасібірска, Кіева.

Для тэлегледачоў братніх рэспублік Мінская студыя накіравала запісаныя і знятыя на плёнку канцэрт народнага артыста БССР З. Бабія і канцэрт Дзяржаўнага ансамбля танца БССР.

Над Нёманам песня плыве...

Фотаэцюд М. РУБІНШТЭЙНА.

ПАДАРУНАК ГЕНЕРАЛА

Ёсць на Магілёўшчыне нічым не прыкметная вёска Ржаўка. У самым яе цэнтры, на пагорку, стаіць невялікі, дагледжаны дамок з шыльдаю на фасадзе: «Бібліятэка імя Я. І. Драйчука». У чытальнай зале вісіць партрэт далёка ўжо немаладога чалавека з добрым, ветлівым тварам. Ён у генеральскай форме, на грудзях — ордэны, медалі СССР і іншых дзяржаў. Гэта і ёсць Якаў Іванавіч Драйчук, імя якога па хадайніцтву саміх калгаснікаў Слаўгарадскі райвыканком прысвоіў сельскай бібліятэцы.

Гісторыя яе пачалася ў знамянальныя дні работы гістарычнага XXII з'езда КПСС. У дзень адкрыцця з'езда ў Ржаўку прыбыла з Падмаскоўя першая партыя кніг, а трошкі раней—добрае, душэўнае пісьмо і грашовы перавод на 5.600 рублёў.

Цяпер у Ржаўскай бібліятэцы каля 16 тысяч новых кніг: поўны збор твораў Ул. І. Леніна, працы Маркса і Энгельса, шмат мастацкай, навуковай, ваеннай, мастацтвазнаўчай літаратуры. Па сціплых падліках, Якаў Іванавіч ужо выдаткаваў на стварэнне сельскай бібліятэкі амаль сем тысяч рублёў.

Сярод мноства пісьмаў, атрыманых Драйчуком ад сваіх землякоў, ёсць і ўсхваляванае пасланне ад заслужанай настаўніцы школ БССР Надзеі Апанасаўны Арол. «Усё, што толькі цікавіць людзей, — піша яна, — можна атрымаць у Ржаўскай бібліятэцы. Я асабіста дзякую Вам за гэты дар, дар сапраўднага чалавека, высакароднага сэрца. Жадаю Вам не хварэць, наведаць тыя мясціны, дзе прайшлі Ваша маленства і юнацтва...»

Старая настаўніца не выпадкова загаварыла пра хваробы. Якаў Іванавіч пражыў вялікае, цяжкое жыццё і дэмабілізаваўся з арміі па стану здароўя. Ён — удзельнік грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў, шмат гадоў знаходзіўся на партыйнай рабоце, у гады калектывізацыі быў сакратаром райкома партыі, адказным работнікам ЦК Кампартыі Беларусі, пазней — камісарам авіяцыйнага злучэння. Куды толькі не кідаў яго неспакойны ваенны лёс! Змагаўся ён і з бандамі Булах-Булаховіча, і з фашысцкімі захопнікамі.

І выйшаўшы на пенсію, Якаў Іванавіч, аднак, не перастаў займацца грамадска-карыснай працай. У Люберцах, дзе ён жыве, генерала ў цывільным ведаюць як намесніка старшыні бацькоўскага камітэта сярэдняй школы, члена дамавога камітэта, аднаго з кіраўнікоў дзіцячай тэхнічнай станцыі, дзе з цікавасцю займаюцца сотні дзяцей.

У стварэнні сельскай бібліятэкі Якаву Іванавічу памагае яго жонка Зінаіда Васільеўна, таксама стары член партыі, у мінулым настаўніца. Памагае і грамадскасць, у прыватнасці работнікі Інстытута гаручых выкапняў. Калі яны даведаліся, што Драйчук задумаў пабудаваць у вёсцы Ржаўка новы будынак для бібліятэкі-чытальні, яны тут жа прапанавалі свае паслугі і на грамадскіх асновах падрыхтавалі праект будынка, усю тэхнічную дакументацыю. Уключыліся ў гэтую справу, вядома, партыйныя і савецкія арганізацыі Слаўгарадскага раёна.

Мы пабывалі ў Якава Іванавіча дома. Усюды — кнігі. Колькі іх тут — сказаць цяжка. Імі літаральна забіты шафы, сталы, тумбачкі... Тут жа поўныя папкі з сотнямі пісьмаў ад калгаснікаў, вучоных, старых бальшавікоў, Маршалаў Савецкага Саюза, вядомых пісьменнікаў, мастакоў і артыстаў, партыйных і савецкіх работнікаў. Усе яны захапляюцца высакародным учынкам старога генерала-камуніста, жадаюць яму поспехаў у харошым, добрым пачынанні. І не толькі захапляюцца. За параўнаўча кароткі тэрмін яны прыслалі ў дар сельскай бібліятэцы сотні лепшых сваіх кніг, альбомаў.

Кнігі паступаюць адусюль. На многіх з іх — надпісы на рускай, украінскай, беларускай, эстонскай, татарскай і іншых мовах. Сотні тамоў падарылі са сваіх багатых фондаў Ленінская, Сельскагаспадарчая, Гістарычная і іншыя бібліятэкі.

Больш 700 пісьмаў напісаў Якаў Іванавіч знатным людзям краіны з просьбай прысласць свае друкаваныя працы з аўтографам для сельскай бібліятэкі. І ні адно пісьмо не засталося без адказу. Мы бачылі ў Драйчука кнігі з надпісамі Шолахава, Твардоўскага, Міхалкова, Паўстоўскага, Карнейчука, Ганчара, Броўкі, Межэлайціса, Маршака, Чукоўскага, С. С. Смірнова, Суркова, Сіманава... Сотні вядомых пісьменнікаў прыслалі свае кнігі Ржаўскай бібліятэцы і для асабістай бібліятэкі генерала-кнігалюба ў знак сваёй удзячнасці і павагі.

Прыслалі свае кнігі з аўтографамі, шчырымі надпісамі і многія вядомыя савецкія ваеначальнікі. Гэта Маршалы Савецкага Саюза І. Х. Баграмян, В. І. Чуйкоў, К. К. Ракасоўскі, К. А. Мерацкоў, Галоўны маршал артылерыі М. М. Воранаў, маршал авіяцыі С. І. Рудэнка і многія іншыя. Незадоўга да сваёй трагічнай гібелі падарыў сваю кнігу «Калі грымелі гарматы» Маршал Савецкага Саюза С. С. Бірузоў. На яе тытульным лісце надпіс: «Дарагім чытачам бібліятэкі калгаса «Савецкая Беларусь», энтузіястам кнігі — Якаву Іванавічу Драйчуку і яго жонцы на добры ўспамін ад аўтара».

Адгукнуліся на просьбу Драйчука і нашы, дружныя ва ўсім, касманаўты. Мы бачылі кнігі «Дзень добры, Сусвет!», «Семнаццаць касмічных зорак» і іншыя з аўтографамі і шчырымі надпісамі Юрыя Гагарына, Германа Цітова, Валянціны Церашковай-Нікалаевай, Валерыя Быкоўскага.

Пішуць Драйчуку сябры па грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнах. І як не радавацца! У мінулым радавыя салдаты сталі цяпер генераламі і маршаламі, вядомымі вучонымі, пісьменнікамі.

Беражліва захоўваюцца ў Ржаўскай і асабістай бібліятэцы Драйчука кнігі і пісьмы старых бальшавікоў. Сярод іх успаміны ветэранаў ленінскай гвардыі, Герояў Сацыялістычнай Працы Ф. Н. Пятрова, А. Д. Стасавай, былога камеданта Маскоўскага Крамля П. Д. Малькова, акадэміка І. М. Майскага, Е. Я. Драбкінай, якая працавала ў прыёмнай старшыні ВЦВК Я. М. Свярдлова.

Л. А. Фоціева ў сваім пісьме Якаву Іванавічу піша:

«Радасна ведаць, што савецкія людзі нават у пенсійным узросце працягваюць працаваць на агульную карысць. Сапраўды праца стала для нас жыццёвай патрэбай».

Гэтымі поўнымі глыбокага сэнсу словамі нам і хацелася б закончыць расказ пра генерала ў цывільным — Якава Іванавіча Драйчука і створаную ім сельскую бібліятэку.

Мікалай ЧАЙКА.
(АДН).

ЗЯЛЁНЫЯ АЎТОГРАФЫ

На доследнай станцыі субтрапічных і паўднёвых пладовых культур у горадзе Сочы ёсць вядомае «Дрэва дружбы». Ганаровыя госці нашай краіны робяць на ім прышчэпкі, пакідаюць цёплыя запісы ў Кнізе наведвальнікаў. Учора на «Дрэве дружбы» налічвалася 132 прышчэпкі, а сёння — іх ужо 138.

Цытрусавае дрэва шмат гадоў даглядае старшы навуковы супрацоўнік доследнай станцыі Фёдар Зорын. У гутарцы з карэспандэнтам АДН ён расказаў:

— Сёлета мы будзем адзначаць своеасаблівы юбілей. Спаўняецца 25 гадоў з часу першай прышчэпкі на «Дрэве дружбы». Яе зрабіў вядомы палярнік Ота Юльевіч Шмідт. Услед за ім новыя галінкі на дрэве прышчапілі нашы госці са 124 краін свету. Частку прышчэпак зрабілі ў гонар выдатных палітычных і дзяржаўных дзеячоў—у гонар Тальмана, Піка, Лумумбы, Неру, Дж. Кенедзі. Памяць аб іх на «Дрэве дружбы» пакінулі іх сябры. Разраслася галінка, прышчэпленая прэзідэнтам Дэмакратычнай Рэспублікі В'етнам Хо Шы Мінам. Цяперашні прэзідэнт Аўстрыі Франц Іонас зрабіў прышчэпку два гады назад, калі быў яшчэ бургамістрам Вены. У кнізе ганаровых наведвальнікаў ён напісаў: «Той, хто хоча працаваць для будучыні, павінен саджаць дрэвы і будаваць школы».

У Сочы некалькі дзён гасціла гандлёвая дэлегацыя з Турцыі. Кіраўнік дэлегацыі Эркен Герып пакінуў такі запіс: «Сёння мы зрабілі прышчэпку на «Дрэве дружбы». Мы маліліся, каб прышчэпка садзейнічала дружбе паміж нашымі краінамі на вечныя часы».

На доследнай станцыі пабывала госця горада-курорта, сціплая японская жанчына, сябра савецкага разведчыка Рыхарда Зорге Ісіі Ханако. Зрабіўшы прышчэпку, яна напісала: «Рыхард Зорге змагаўся за мір, горача любіў Савецкую Радзіму. Гэтай галінцы я даю імя Зорге, каб людзі доўга памяталі яго».

Зялёныя аўтографы на «Дрэве дружбы» пакінулі савецкія касманаўты, а таксама героі Савецкага Саюза, удзельнікі штурму рэйхстага.

АДН.

М. Л. ТАРАСІКАЎ

Раптоўна памёр таленавіты мастак Мікола Лукіч Тарасікаў, вялікі жыццялюб, адданы роднаму мастацтву, якому прысвяціў усё сваё жыццё.

Нарадзіўся М. Л. Тарасікаў у 1908 годзе. У 1923—1927 гг. ён вучыцца ў Гомельскай студыі выяўленчага мастацтва і Віцебскім мастацкім тэхнікуме, у 1935 годзе заканчвае Адэскі мастацкі інстытут.

З 1935 г. М. Л. Тарасікаў прымае актыўны ўдзел у творчым і грамадскім жыцці мастакоў Беларусі. Яго творчасць прасякнута вялікай любоўю да роднай прыроды, да чалавека, да ўсяго лепшага і прыгожага.

Памяць аб М. Л. Тарасікаве назаўсёды застанецца ў нашых сэрцах.

Група таварышаў.

Фелікс ДЗЯРЭЦКІ

РАШЭННЕ

З ЗАМЕЖНАГА ГУМАРУ

Бедранкевіч сядзеў у сакратарыяце ў поўнай роспачы. Там, за дзвярыма, абабітымі цыратаю, вырашаўся яго лёс. Горш таго — быў ужо вырашаны. Бедранкевіча звальнялі. Калі дырэктар даведаўся, што бяздарнае рашэнне Бедранкевіча нанесла ўстанове вялікую шкоду, ён ледзь не ашалеў. Да таго ж дырэктара выклікалі ў вышэйшую інстанцыю, дзе ён вымушаны быў лыпаць вачыма і выслухоўваць непрыемныя словы.

— Неадкладна звольніць! — крычаў ён, вярнуўшыся. — Хопіць трымаць безадказных ідыётаў на адказных пасадах.

І вось настаў крытычны момант. Дырэктар выклікаў Бедранкевіча, каб асабіста ўручыць яму загад аб звальненні. Бедранкевіч зміры ўся з лёсам, нават баяцца перастаў ужо, хацеў толькі, каб усё гэта хутчэй скончылася. Але чаканне зацягвалася. Відаць, дырэктар хацеў тым самым выказаць пагарду, якую ён адчуваў да чыноўніка.

— Я вельмі вам спачуваю, — сказала сакратарка, панна Казя. — Шэф у жахлівым настроі, але вы не хвалюйцеся.

Лёгка сказаць. Для Бедранкевіча звальненне было катастрофай. Цяпер трэба будзе вярнуць доўг касе ўзаемадапамогі, а дзе ўзяць грошы на купленую ў растэрміноўку мэблю! Рухнулі і ўсе адпускныя планы. А галоўнае, хто возьме яго цяпер на работу з такой характарыстыкай!

Панна Казя выйшла заварыць чай. Бедранкевіч застаўся ў сакратарыяце адзін. Усеўся зручней на крэсле і пачаў барабаніць пальцамі па стале. Яго погляд затрымаўся на тэлефоне, злучаным з кабінетам дырэктара. Якія высокапастаўленыя асобы размаўляюць па гэтым тэлефоне! Досыць зняць трубку, каб пачуць голас дырэктара. Ён сам не ведаў, як гэта здарылася.

— Паслухайце, таварыш дырэктар, — сказаў Бедранкевіч змененым голасам.—Мы чулі, што вы хочаце звольніць Бедранкевіча. Няправільнае рашэнне. Гэта каштоўны чалавек, мы ў ім зацікаўлены. Разумееце, зацікаўлены.

— Вядома, я разумею, але, даруйце, хто гаворыць, я добра не пачуў прозвішча, — няўпэўненым голасам дапытваўся дырэктар.

— Ну, ну, без жартаў, вы ведаеце, хто гаворыць. Я канчаю, па другім тэлефоне звоніць міністр. Прывітанне, — і Бедранкевіч паклаў трубку.

Ён зрабіў гэта вельмі своечасова. Увайшла панна Казя з чаем.

— Яшчэ не прыняў вас?—спачувальна сказала яна. — Звер.

Дзверы кабінета расчыніліся і Бедранкевіч апынуўся ў абдымках дырэктара.

— Не бядуйце, калега. Да вас, напэўна, дайшлі чуткі пра звальненне, не верце, гэта высмактанае з пальца глупства. Наадварот, мы хочам даверыць вам больш адказную пасаду. Іменна па гэтым пытанні я вас выклікаў. Прабачце, што прымусіў чакаць.

Раптам пачуўся грукат. Дырэктар і чыноўнік павярнуліся.

Гэта панна Казя, падобная ў гэты момант на жонку Лота, якая ператварылася ў саляны слуп, ушанавала вылучэнне Бедранкевіча салютам—упусціла шклянку.

Часопіс
«Польскі агляд».

ТЭЛЕБАЧАННЕ

13 ліпеня

Першая праграма. 11.00 — «Мінута гісторыі». Мастацкі фільм. 16.50 — праграма перадач. 16.55 — «Заўтра — спартакіяда». Аб IX Усесаюзнай спартакіядзе школьнікаў. 17.20—Сусветны кангрэс міру ў Хельсінкі. «У імя жыцця на зямлі». Тэлевізійны нарыс (М). 17.30 — для дашкольнікаў і малодшых школьнікаў. «Сонцаварот». Перадача з Ленінграда. 18.00 — тэлевізійныя навіны. 18.20 — «Другое жыццё капітана». Кінанарыс. 18.40 — музычны антракт. 18.50 — народны мастак СССР лаўрэат Ленінскай прэміі С. Т. Канёнкаў (М). 19.20 — «Свет сёння» (М). 20.00 — В. Пямяранцаў. «Складаны хворы». Прэм'ера тэлеспектакля. Перадача з Ленінграда. 21.30 — тэлевізійныя навіны (М) 22.00— «Еўдакія», Мастацкі фільм.

Другая праграма. 18.00 — тэлевізійныя навіны. (М). 18.20 — «Сельская навіна». Тэлечасопіс. Перадача з Краснадара. 18.50 — «Яшчэ раз пра бяспеку руху». Выступленне работнікаў ДАІ. 19.10— для веруючых і няверуючых. «Трынаццаты апостал». Кароткаметражны фільм. 19.40 — «Чужы дом». Мастацкі фільм. 21.10 — «Розум супраць вар'яцтва». Дакументальны фільм. 22.00 —творчы вечар Горкаўскага абласнога драматычнага тэатра імя М. Горкага (М).

14 ліпеня

Першая праграма. 11.00 — «Еўдакія». Мастацкі фільм. 17.25 — праграма перадач. 17.30 — для школьнікаў. «Сто задум двух сяброў» (М). 18.00 — для малышоў. Мультыплікацыйны фільм. «Непаседа, Мякіш і Нітак». 18.10 — тэлевізійныя навіны. 18.30 — канцэрт фартэпіяннай музыкі. 18.50—«Горад наш любімы». Знаёмства з новым альбомам «Мінск». 19.05 — «Крыніцы», Мастацкі фільм. 20.30 — «Вокны насцеж». Кінанарыс. 20.50—«Марсельеза». Прэм'ера музычнага спектакля. Перадача з Ленінграда. 21.30 — тэлевізійныя навіны (М). 22.00 — у эфіры — «Маладосць». «Арбіта» (М). 23.30 — канцэрт арганнай музыкі. Перадача з Венгрыі.

Другая праграма. 18.00 — тэлевізійныя навіны (М). 18.20 — «Навука — вытворчасці» (М). 19.10 — на IV Міжнародным кінафестывалі (М). 20.00 — праўда аб рэлігіі. «Добры дзень, жыццё!». Тэлевізійны фільм (М). 20.30 — «Дзяржынцы». Тэлевізійны фільм (М). 20.50— наш кінаглобус. «Сцежкаю джунгляў». Навукова-папулярны фільм.

15 ліпеня

Першая праграма. 15.55 — праграма перадач. 16.00 — рэпартаж аб Усесаюзнай спартакіядзе школьнікаў (трансляцыя на Маскву). 17.00 — для школьнікаў. «Светлячок (пра юных турыстаў). Перадача з Пярмі. 17.30 — для дашкольнікаў і малодшых школьнікаў. «Умелыя рукі» (М). 18.00 — тэлевізійныя навіны. 18.20 — «Рэзервы гімнастыкі» (аб спаборніцтвах на кубак СССР па спартыўнай гімнастыцы сярод жанчын). 18.40— «І клопаты і патрабавальнасць». Удзельнікі VII пленума ЦК ВЛКСМ расказваюць пра тое, як іх камсамольскія арганізацыі ператвараюць у жыццё рашэнні пленума. 19.00 — першынство СССР па футболу. «Дынама» (Кіеў) — «Дынама» (Тбілісі). Перадача з Кіева. 20.45 — канцэрт-серанада. 21.10 — «Для тых, хто застаўся ў горадзе». Рэпартаж-рэйд. 21.30 — эстафета навін. (М). 23.00 — па вашых просьбах. «Дванаццатая ноч». Мастацкі фільм.

Другая праграма. 18.00 — тэлевізійныя навіны (М). 18.30 — «Здароўе». Тэлевізійная праграма. Перадача з Кіева. 19.00 — «За вітрынай універмага». Мастацкі фільм. 20.30 — па Камчатцы. Кінанарыс. 20.45 — «Працаўнікам палёў». Канцэрт Дзяржаўнага ансамбля танца УССР (М). 21.30 — «Глобус Напалеона». Кінанарыс. 21.40—«Іраклій Андронікаў расказвае». Тэлевізійны фільм. 23.00 — «Усяго адно жыццё». Кінанарыс (М). 23.30 — румынскія народныя песні і танцы. Перадача з Бухарэста.

Галоўны рэдактар Н. Е. ПАШКЕВІЧ.

Рэдакцыйная калегія: З. І. АЗГУР, Г. М. БУРАЎКІН, А. І. БУТАКОЎ, К. Л. ГУБАРЭВІЧ, Т. А. ДУБКОВА, Г. М. ЗАГАРОДНІ, В. Ул. ІВАШЫН, А. М. КАШКУРЭВІЧ, В. Б. ЛАДЫГІНА, П. М. МАКАЛЬ, А. Н. МАРЦІНОВІЧ, Р. К. САБАЛЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), І. А. САНКОВА, З. Ф. СТОМА, М. Г. ТКАЧОЎ, Р. Р. ШЫРМА.

«Літаратура і мастацтва» выходзіць у аўторак і пятніцу.

НАШ АДРАС І ТЭЛЕФОНЫ: г. Мінск вул. Захарава, 19. Тэлефоны: прыёмнай рэдакцыі — 3-24-61, намесніка галоўнага рэдактара—3-25-25, адказнага сакратара—3-44-04, аддзела літаратуры—3-21-53, аддзела мастацтва — 3-24-62, аддзела культуры — 3-22-04, аддзела інфармацыі—3-44-04, выдавецтва—6-25-19, бухгалтэрыі—6-97-44.

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР. Минск.

Друкарня выдавецтва «Звязда». Індэкс 63856. АТ 13892